

СЕНСАЦЫЯ З БІЯЭТЫЧНАЙ КАЛІЗІЯЙ

6

НЕ ПРАГУЛЯЦЬ СВАЁ ЖЫЦЦЁ

ЧЫРВОНКА



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

10 ЛЮТАГА 2022 г. ЧАЦВЕР № 27 (29649)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Генадзь БАЛБАТОЎСКІ, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва:**

*«Тое, што нашы здраўніцы цяпер стабільна функцыянуюць і развіваюцца — вынік шматгадовай карпатлівай і планамернай работы па забеспячэнні належнай якасці беларускіх лячэбна-аздараўленчых паслуг. За амаль чвэрць стагоддзя ўдалося не толькі захаваць, але і рэалізаваць патэнцыял выкарыстання прыродных лячэбных фактараў для ўмацавання здароўя насельніцтва, вывесці беларускія здраўніцы на міжнародны рынак лячэбна-аздараўленчых паслуг, замацавацца на ім і забяспечыць доўгатэрміновую канкурэнтаздольнасць. У нестабільнай эпідэмічнай сітуацыі яны функцыянуюць як належыць арганізацыям аховы здароўя — у нармальным санітарна-эпідэміялагічным рэжыме».*

## КОРАТКА

- **Касавае абсталяванне з 18 мая абавязковае пры гандлі прадуктовымі таварамі на кірмашах.**
- Больш за тысячу адзінак зброі вывелі з абароту ў Гомельскай вобласці ў 2021 годзе.
- **Вуліцу ў Брэсце пераймянуюць у гонар мітрапаліта Філарэта.**

ISSN 1990 — 763X

# Па залатым кальцы Шчучыншчыны



У Шчучынскім раёне некалькі гадоў таму быў рэалізаваны краязнаўчы праект «Вандроўкі па Шчучынскім раёне», у працэсе якога вучні ўстаноў адукацыі, іх бацькі і педагогі выраблялі макеты славутасцяў дойлідства малой радзімы — цэркваў, касцёлаў, сядзіб і палацавых комплексаў. Цяпер гэтыя мініяцюрныя копіі (сапраўдныя мастацкія творы) месцяцца ў раённым Цэнтры турызму і краязнаўства, з імі знаёмяцца навучэнцы з сельскіх і гарадскіх школ, тут наладжваюць віртуальныя і інтэрактыўныя экскурсіі, квэст-гульні, праводзяць тэматычныя заняткі і такім чынам папулярызуюць сваю гістарычна-культурную спадчыну.

— Гэтая экспазіцыя цікавая і гасцям горада, — кажа дырэктар Алена АРАБЧЫК *(на фота справа)*. — Не сакрэт, што Шчучыншчына займае трэцяе месца ў вобласці па колькасці захаваных помнікаў.

Алена Іванаўна працуе ў сістэме дадатковай адукацыі амаль трыццаць гадоў, стварыла сапраўдную школу краязнаўцаў і ганарыцца выхаванцамі. Асаблівы гонар яна адчувае ў сувязі з тым, што Цэнтру даручана даглядаць помнік сусветнай спадчыны, які занесены ў спіс ЮНЕСКА, — знойдзены геадэзічны пункт дугі Струвэ. У калекцыі макетаў з'явілася копія і гэтага манумента. А дапамагае рупліваму кіраўніку педагог-арганізатар Вікторыя СМАРОДСКАЯ.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Боегатоўнасць

## МАШТАБНЫЯ МАНЕЎРЫ

**Сёння пачалося беларуска-расійскае вучэнне «Саюзная рашучасць — 2022»**



**Яно праходзіць у рамках сумеснай праверкі сіл рэагавання Саюзнай дзяржавы і з'яўляецца яго завяршальным этапам. Вучэнне накіравана, перш за ўсё, на павышэнне навучанасці войскаў. Ваеннаслужачыя будуць адпрацоўваць пытанні папярэджання і адбіцця агрэсіі падчас вядзення абарончай аперацыі, супрацьдзеяння тэрарызму і абароны інтарэсаў Саюзнай дзяржавы. Манеўры, як раней акцэнтаваў увагу адказны за вучэнне, начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Беларусі, генерал-маёр Віктар ГУЛЕВІЧ, маюць выключна абарончы характар і не складаюць пагрозы ні для якой з дзяржаў.**

СТАР. 2

Правілы бяспекі

## Халады з задавальненнем: як адчуць і захаваць атмасферу зімовых забаў

**Сёлетняя зіма працягвае радаваць нас снегам, і арганізатары спартыўна-масавых спаборніцтваў раяць скарыстацца надвор'ем, каб разнастаіць свой вольны час зімовымі забавамі. Варыянты самыя розныя — ад ціхай сямейнай хадзьбы на лыжах у суседнім з домам паркам да паездкі на гарналыжныя комплексы. Ёсць і больш экзатычныя, скажам, забег з голым торсам з наступным абліваннем халоднай вадой.**

СТАР. 13



# МАШТАБНЫЯ МАНЕЎРЫ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як паведаміла падчас брыфінгу **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства абароны Беларусі Іна ГАРБАЧОВА**, для работы на вучэнне акрэдытацыю атрымала звыш 150 журналістаў, якія прадстаўляюць беларускія, расійскія і замежныя сродкі масавай інфармацыі. Упершыню для работы на вучэнні Мінабароны запрасіла беларускіх блогераў і лідараў грамадскай думкі.

Падчас прэс-тураў журналістам і блогерам будзе прапанавана наведаць участкі практычных дзеянняў войскаў. 12 лютага на палігоне «Гожскі», паводле задумы вучэння, запланавана вядзенне бою ў раёне засадных дзеянняў падраздзяленнямі баявой аховы з разведкай праціўніка. Гледачы на свае вочы ўбачаць вядзенне манеўранай абароны пры падтрымцы авіяцыі і артылерыі, правядзенне контратакі агульнавайсковым рэзервам на ўчастку ўкліньвання праціўніка.

15 лютага на ўчастку мясцовасці «Палескі» ажыццявіць баявы пуск тактычны ракетны комплекс «Точка», падчас якога будзе нанесены групавы ракетны ўдар па двух аб'ектах умоўнага праціўніка на далёкасці да 70 кіламетраў. На палігоне «Абуз-Лясноўскі» 19 лютага запланавана вядзенне абарончага бою на манеўраным рубяжы абароны з наступным выхадам з бою на аператыўны абарончы рубеж. Падчас гэтага эпізоду будзе нанесена паражэнне ўмоўнаму праціўніку, адбудзецца контратака з высадкай тактычнага паветранага дэсанту ў тыле праціўніка. Усе этапы абарончага бою пройдуць пры падтрымцы авіяцыі і артылерыі. Як заўважылі ў Мінабароны, у праграму і даты прэс-тураў могуць быць унесены змяненні.

Вучэнне працягнецца да 20 лютага. Пасля яго завяршэння вайсковыя часці і падраздзяленні Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі пакінуць тэрыторыю нашай краіны, што і адбывалася пасля ўсіх папярэдніх падобных мерапрыемстваў баявой падрыхтоўкі.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота «Ваяр».**

## У тэму



**Намеснік міністра замежных спраў Беларусі Сяргей АЛЕЙНІК:**

— На заходніх граніцах Беларусі адбываецца нарошчванне сіл і сродкаў НАТА, мадэрнізуецца ваенная інфраструктура, растуць інтэнсіўнасць і маштабы мерапрыемстваў аператыўнай і баявой падрыхтоўкі краін — членаў альянсу на еўрапейскім кантыненце. За апошні год колькасць вучэнняў кааліцыйных фарміраванняў краін — членаў альянсу вырасла больш чым у тры разы. Пры гэтым Беларусь, як і нашых расійскіх саюзнікаў, абвінавачваюць у нагнятанні абстаноўкі ў рэгіёне. Свежы прыклад — нервовая рэакцыя Захаду, перш за ўсё Украіны, Польшчы і прыбалтыйскіх дзяржаў, якія мяжуюць з намі, на расійска-беларускія вучэнні «Саюзная рашучасць — 2022». Падрыхтоўка да вучэнняў адбываецца максімальна транспарэнтна, шырока асвятляецца абароннымі ведамствамі Беларусі і Расіі, масмедыя дзвюх краін. Пры гэтым грамадскасць еўрапейскіх дзяржаў працягваюць палохаць кожным сумесным беларуска-расійскім вучэннем, наўмысна забываючы аб тым, што пасля кожнага вучэння ўсе войскі вяртаюцца назад у пункты пастаяннай дыслакацыі ў Беларусі і Расіі.

Гучная справа

# ПОЛЬСКІ ВАЙСКОВЕЦ РАСКАЖА АБ РАССТРЭЛАХ БЕЖАНЦАЎ

## Эміль Чэчка правядзе прэс-канферэнцыю



Сёння цэнтр «Сістэмная праваабарона» арганізуе прэс-канферэнцыю польскага вайскоўца Эміля Чэчкі. Падчас мерапрыемства хлопец падрабязна раскажа і пакажа на карце месцы масавых расстрэлаў (пахаванняў) і падзеліцца інфармацыяй аб тым, як былі арганізаваны ўвесь працэс расстрэлаў: пачынаючы з моманту адбору салдат і перадачы іх у распараджэнне прадстаўнікоў пагранічнай варты, як былі арганізаваны падвоз мігрантаў да месца расстрэлаў, хто аддаваў злачынныя загады, як ажыццяўляліся расстрэлы, якія здзяйсняліся польскімі салдатамі пад пагрозай смерці з боку так званых пагранічнікаў, як здзейсніў уцёкі і чаму абраў для гэтага Беларусь.

Прэс-канферэнцыя Эміля Чэчкі для міжнароднай супольнасці вельмі важная, адзначыў БелТА палітолаг Вадзім Баравік. «Нашы польскія «сябры» заяўляюць аб тым, што яны стаяць на перадавой абароны правоў чалавека, хоць сваімі дзеяннямі часта, на жаль, паказваюць адваротнае. Аднак яны павінны ў першую чаргу праявіць цікавасць да заяў свайго ваеннаслужачага, які добраахвотна перасек граніцу, і такую рэзанансную інфармацыю прадставіў грамадскасці. А на сённяшні момант ёсць заявы польскага вайскоўца. Мы мелі факты таго, што нам падкідвалі напаўмёртвых бежанцаў на граніцу і польскі бок цалкам ігнаруе ўсе гэтыя заявы, не дапускае журналістаў, не дае магчымасці правесці міжнароднае расследаванне і іншае. Таму калі мы гаворым пра правы чалавека, пра тое, што нейкія краіны ў гэтым пытанні ў большай ступені прасунуліся, і бачым у Еўропе жорсткае абыходжанне з дэманстрантамі, бежанцамі, агрэсію ў адносінах да асоб, якія маюць патрэбу ў дапамозе, то пераконваемся ў тым, што такія паняцці, як правы чалавека і права на жыццё (а гэта самае асноўнае права) проста выкарыстоўваюцца як маніпулятыўныя паняцці», — заўважыў Вадзім Баравік.

Палітолаг падкрэсліў, што на Захадзе часта «выціраюць ногі» аб міжнароднае права. «Спадзяюся, што будзе прыкавана ўвага і міжнародных СМІ да яго заяў. Мы ж ведаем, што ў Польшчы ёсць праваабаронцы, валанцёры, якія выганяюць з граніцы і якія цікавяцца гэтым пытаннем, занепакоеныя гэтымі заявамі. Думаю, што падчас прэс-канферэнцыі, калі яшчэ больш падрабязна на нейкія факты ён зробіць акцэнты, то будзем спадзявацца, што гэта прыцягне ўвагу міжнароднай грамадскасці», — адзначыў палітолаг.

Вадзім Баравік упэўнены ў важнасці гэтай прэс-канферэнцыі. «Гэта сведчыць аб тым, што Беларусі неабыякавы лёс тых асоб, якія праз нашу тэрыторыю спрабавалі трапіць у «свабодную» Еўропу для таго, каб выратаваць сябе ад гуманітарнай катастрофы і выратаваць сваё жыццё. Мы, у сваю чаргу, далі ім магчымасць знаходжання. Забяспечылі ім прыстанішча. Польскі бок... Мы бачым, у якіх умовах утрымліваюцца гэтыя людзі. Вось яшчэ факты ўсплываюць аб тым, што яны практычна знішчаліся, — адзначыў палітолаг. — Таму, сапраўды, сур'ёзная прэс-канферэнцыя. Ёй павінна быць удзелена самая пільная ўвага не з пункту гледжання журналісцкага расследавання і асвятлення, а ў першую чаргу з пункту гледжання міжнароднага расследавання. За гэтым павінна рушыць услед сур'ёзнае міжнароднае расследаванне. Гэта нават несупастаўна з сітуацыяй з самалётам. Калі над намі ляцеў самалёт і была тэрарыстычная пагроза, учынілі шум на ўвесь свет, незаконна авіякампанію падверглі санкцыям і даставілі нязручнасці ўсёй Еўропе з улікам палётаў праз Беларусь. Тут забіваюць людзей — ёсць пэўныя заявы. І, разумееце, поўнае ігнараванне з боку міжнародных інстытутаў. Павінна падключыцца ААН і павінны расследаваць на самым высокім узроўні. Калі пацвердзіцца нават на дзесяць працэнтаў таго, што ён кажа, — павінны быць самыя сур'ёзныя санкцыі ў дачыненні да Польшчы».

## У тэму

Польскі грамадзянін Эміль Чэчка, 1996 года нараджэння, ваеннаслужачы 11-га Мазурскага артылерыйскага палка 16-й Паморскай механізаванай дывізіі імя караля Казіміра (часці перакінуты для забеспячэння аховы ўчастка граніцы з Беларуссю ў перыяд дзеяння надзвычайнага становішча на прыгранічных тэрыторыях Польшчы) быў затрыманы 16 снежня 2021 года ў пагранічнай паласе. Ён папрасіў палітычнага прыстанішча ў Беларусі «ў сувязі з нязгодай з палітыкай Польшчы адносна міграцыйнага крызісу і практыкай негуманнага абыходжання з бежанцамі». Цяпер Эміль Чэчка праходзіць сведкам у крымінальнай справе аб гібелі мігрантаў на беларуска-польскай граніцы, распачатай Следчым камітэтам Беларусі. Польскі грамадзянін пры пасрэдніцтве праваабарончага цэнтра знаходзіцца ў працэсе атрымання статусу бежанца ў Беларусі.

Эміль Чэчка падаў іск «Аб генацыдзе і злачынствах супраць чалавечнасці на тэрыторыі Польшчы» пракурору міжнароднага крымінальнага суда ў Гаазе (іскавая заява прынята да разгляду). Паводле яго слоў, ён асабіста (пад пагрозай смерці з боку прадстаўнікоў пагранічнай варты Польшчы) узяў удзел у расстрэле больш як 200 бежанцаў, сярод якіх былі жанчыны і дзеці.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Французскія дальнабойшчыкі рыхтуюцца «ўзяць Парыж» па канадскім сцэнарыі

**Тысячы французскіх дальнабойшчыкаў, натхнёных пратэстоўцамі ў Канадзе, плануюць 12 лютага заехаць у Парыж. Эксперты мяркуюць, што акцыя, якую арганізатары называюць «Канвой свабоды», можа паўтарыць сцэнарый «жоўтых камізэлек», паведамляе Euronews.**



Удзельнікі плануюць падзяліцца на шэсць «канвояў», якія ўжо сёння адправяцца ў складзе аўтакалон або самастойна з Баёны, Ніцы, Страсбурга, Брэста, Перпіньяна і Шэрбура. Дэманстранты маюць намер дабрацца да Парыжа ў пятніцу ўвечары. Дакладнае месца сустрэчы не называецца. Пры гэтым некаторыя ўдзельнікі заклікаюць да «еўрапейскага аб'яднання» ў Бруселі ў панядзелак, 14 лютага.

Як і ў Канадзе, французскія дальнабойшчыкі выступаюць за свабоду перамяшчэння і супраць вакцынных пашпартоў. Аднак, нягледзячы на пэўнае падабенства, французскі рух адрозніваецца ад канадскага. Паўночнаамерыканскі быў ініцыіраваны дальнабойшчыкамі, для якіх вакцына — абавязковая ўмова для перасячэння граніцы з ЗША. У Францыі ж пратэст блізкі да руху «жоўтых камізэлек», якія выступаюць з канца 2018 года з сацыяльна-эканамічнымі патрабаваннямі. Адзін з удзельнікаў акцыі пратэсту, які пажадаў застацца ананімным, паведаміў журналістам, што французскі «Канвой свабоды» — новы спосаб выказаць агульную незадаволенасць тым, што адбываецца ў краіне.

## У МЗС Расіі назвалі заявы ЗША і ФРГ па «Паўночным патоку — 2» цыркам-шапіто

**Еўрасаюз гатовы трываць любыя праблемы, абы нашкодзіць Маскве, тэма «Паўночнага патоку — 2» ператварылася ў інструмент ціску на Расію, а дыскусіі аб магчымых санкцыях нагадваюць палітычны цырк-шапіто. Пра гэта заявіў намеснік кіраўніка МЗС РФ Сяргей Рабкоў, выступаючы на пляцоўцы клуба «Валдай».**

«Гэта проста такая забава — палітычны цырк-шапіто, якім займаецца Захад. Ёсць група клоўнаў, ёсць група ілюзіяністаў, якія з шапкі выцягваюць зайца за белыя вушы, потым ён ператвараецца ў стужку. Ніхто не ведае — ці быў заяц, ці была стужка, але ўсе задаволеныя. Усе ядуць марожанае і папкорн», — сказаў Рабкоў.

Таксама, паводле яго слоў, «Паўночны паток — 2» даўно ператварыўся ў руках ЗША і не толькі ў інструмент ціску на РФ.

«Людзі бравіруюць тым, што яны гатовыя пераносіць любыя нягоды, абы нашкодзіць Маскве. Вось сутнасць палітыкі Захаду і, у прыватнасці, Еўрасаюза», — рэзюмаваў намеснік міністра.

## Колькасць выпадкаў заражэння каранавірусам у свеце перавысіла 400 млн

**Колькасць зарэгістраваных у свеце выпадкаў заражэння каранавірусам з пачатку пандэміі перавысіла 400 млн, сведчаць даныя амерыканскага Універсітэта Джонса Хопкінса, які вядзе падлікі на аснове інфармацыі міжнародных арганізацый, федэральных і мясцовых улад, паведамляе ТАСС.**

Паводле абноўленай у аўторак інфармацыі, усяго ў свеце зафіксаваны 400. 244. 000 выпадкі інфіцыравання каранавірусам, ад наступстваў выкліканага вірусам захворвання памерлі 5. 761. 208 чалавек.

Па даных універсітэта, адзнака ў 300 млн выпадкаў заражэння каранавірусам была пераадолена крыху больш як месяц таму — 7 студзеня. Больш за ўсё выяўленых выпадкаў інфіцыравання за апошні месяц прыпадае на ЗША (15 149 517), следам ідзе Францыя (8 623 947), на трэцім месцы знаходзіцца Індыя (6 463 821).

# ВЯРХОЎНЫ І КАНСТЫТУЦЫЙНЫ

## Пра тое, якія змяненні новая рэдакцыя Канстытуцыі прадугледжвае ў судовай сістэме, абранні суддзяў і зваротах грамадзян

**Перадача некаторых паўнамоцтваў, датычных да судовай улады, Усебеларускаму народнаму сходу (УНС), з'яўленне асобнага артыкула па Канстытуцыйным Судзе і іншыя змяненні ў судовай сістэме прадугледжаны ў праекце Канстытуцыі, што выносіцца на рэферэндум. На першы погляд, некаторыя з меркаваных і, здавалася б, неабавязковых паправак, маюць рэдакцыйны ці, як кажуць юрысты, юрыдыка-тэхнічны характар, аднак усё не так проста. Маштабныя змяненні ў Канстытуцыю маюць пад сабой вельмі моцнае абгрунтаванне. Па-першае, заканадаўчыя правілы, па якіх жыве краіна, павінны быць актуальнымі, тобок адпавядаць патрабаванням часу, ступені сацыяльнага, эканамічнага і палітычнага развіцця грамадства, стымуляваць пазітыўныя працэсы развіцця. Па-другое, галоўны дакумент краіны павінен быць дакладным і не дапускаць двухсэнсоўнасці, а тым больш унутраных супярэчнасцяў, лічыць Валерый КАЛІНКОВІЧ, першы намеснік старшыні Вярхоўнага Суда, які растлумачыў найбольш істотныя з абазначаных навоўвядзенняў.**



### ПРЫМУСОВАЯ ПРАЦА І МАГЧЫМАСЦЬ ПАСКАРДЗІЦЦА

***— У існуючай рэдакцыі Канстытуцыі напісана, што «судовая ўлада ў Рэспубліцы Беларусь належыць судам» (Артыкул 109). Яе прапануецца замяніць фразай «судовая ўлада ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца судамі». Як адаб'ецца на дзейнасці суда замена аднаго слова, якое фактычна адбірае ў суда валоданне адной з галін улады? І што дасць дабаўленне слова «Канстытуцыя» ў планаваным выразе «Судовы лад у Рэспубліцы Беларусь вызначаецца Канстытуцыяй і законам»?***

— Улада ў краіне наогул належыць народу, і ён жа з'яўляецца адзінай крыніцай улады, таму яна не можа належаць нікому іншаму. Улады толькі ажыццяўляюць паўнамоцтвы, якія на іх ускладзены Канстытуцыяй і законамі. На маю думку, аўтарам папярэдніх тэкстаў канстытуцый трэба было вырашаць значна большыя пытанні адносна формаў улады ў краіне ў прынцыпе, а таксама іх паўнамоцтваў. Аднак цяпер нарматворчы працэс развіўся да іншага ўзроўню, і суды сапраўды цяпер менавіта ажыццяўляюць законы.

У Канстытуцыі замацаваны асноўныя прынцыпы будаўніцтва судовай сістэмы: тэрытарыяльнасць і спецыялізацыя. У Канстытуцыі прадугледжаны асноўныя палажэнні, датычныя вышэйшых айчынных судоў. Вось і атрымліваецца, што судовы лад у краіне па шэрагу момантаў вызначаецца найперш Канстытуцыяй, а ўжо далейшае нарматыўнае рэгуляванне гэтых пытанняў аддаецца на ўзровень іншага заканадаўства.

***— Канстытуцыяй забараняецца прымусовая праца, акрамя работы або службы, вызначанай прысудам суда (Артыкул 41). У змененым варыянце гэта фармулёўка будзе гучаць так: «прымусовая праца забараняецца, акрамя работы або службы на падставе судовай пастановы». Што будзе азначаць такая замена?***

— Сапраўды, прымусовая праца дапускалася па законе толькі на падставе судовага прысуду. Гэта мела месца пры асуджэнні да пазбаўлення волі або пры такой меры крымінальнай адказнасці як умоўнае асуджэнне да пазбаўлення волі з прыцягненнем да працы. Сённяшняе заканадаўства ўтрымлівае ў сабе значна больш палажэнняў, якія дазваляюць прыцягваць чалавека да працы на падставе судовай пастановы. Дарэчы, ёсць новае адміністрацыйнае спагнанне — грамадскія работы, якія накладваюцца судом на аснове не прысуду, а пастановы суда. Згодна з Дэкрэтам № 18 нямдбайныя бацькі павінны прымусова працаваць, каб выплачваць дзяржаве сродкі за ўтрыманне сваіх непаўналетніх дзяцей. Від судовай пастановы пры гэтым залежыць ад віду судаводства, у якім такія рашэнні прымаюцца, таму і прапануецца ўвесці абагульняючы тэрмін «судовая пастанова». Гэта той выпадак, калі палажэнні закона адаптуюцца да сучасных рэалій.

***— Артыкул 60 прапануецца дапоўніць цікавай фразай «рашэнні і дзеянні (бяздзеянне) дзяржаўных органаў і службовых асоб, якія ўшчамляюць правы і свабоды, могуць быць абскарджаны ў суд». Ці зробіць такое дапаўненне сістэму менш бюракратычнай?***

— Абскардзіць рашэнне можна і цяпер. Мяркуецца, што наданне такой магчымасці статусу канстытуцыйнага права зробіць больш аб'ектыўнай работу дзяржорганаў і службовых асоб па задавальненні жыццёвых пытанняў і патрэб насельніцтва. А таксама дапоўніць шэраг канстытуцыйных нормаў, якія забяспечваюць баланс і раздзяленне ўлад, што станоўча ўплывае на стабільнасць дзяржавы ў цэлым. Разгляд падобных скаргаў — своеасаблівая магчымасць судовага кантролю за дзеяннямі іншай галіны ўлады. Тым больш што судовы кантроль прысутнічае не толькі ў грамадзянскім праваабароце — сёння ў суд можна падаць скаргу, напрыклад, на ўзяцце пад варту ці хатні арышт.

### КАМПЕТЭНТНАСЦЬ, ЭКАНАМІЧНАСЦЬ, АПЕРАТЫЎНАСЦЬ

***— Навошта прапануецца да ўнясення ў Канстытуцыю асобны Артыкул 1121 «Вярхоўны Суд узначальвае сістэму судоў агульнай юрысдыкцыі і з'яўляецца найвышэйшым судовым органам, які ажыццяўляе правасуддзе праз грамадзянскае, крымінальнае і іншыя формы судаводства, прадугледжаныя законам»?***

— У артыкулах, якія сёння датычацца судовай улады, існуюць асобныя нормы пра Канстытуцыйны Суд, аднак няма нічога пра Вярхоўны Суд. Ёсць толькі палажэнні пра суды ў агульным сэнсе. Калі дзеючая версія Канстытуцыі прымалася, большую частку пытанняў матэрыяльна-тэхнічнага і кадравага забеспячэння большай часткі судовай сістэмы ўвогуле вырашала Міністэрства юстыцыі. Гэта была савецкая мадэль арганізацыі работы правасуддзя. Аднак у выніку рэформы 2013 года ў краіне створана адзіная сістэма судоў агульнай юрысдыкцыі на чале з Вярхоўным Судом, у межах якой мы вырашаем усе судовыя пытанні. Правая сітуацыя з тых часоў значна змянілася, і калі ў Канстытуцыі азначаецца прававы статус усіх вышэйшых дзяржустаноў і службовых асоб, то відавочна, што ў яе трэба ўключыць нормы пра базавы статус вышэйшых судовых інстанцый.

***— Яшчэ адно прапанаванае змяненне датычыцца фразы Артыкула 113 «справы ў судах разглядаюцца суддзямі калегіяльна, а ў прадугледжаных законам выпадках — аднаасобна». Яе мяркуецца перарабіць на «справы ў судах разглядаюцца суддзямі аднаасобна, а ў прадугледжаных законам выпадках — калегіяльна». Навошта мяняць месцамі гэтыя паняцці?***

— Раней практычна ўсе судовыя справы разглядаліся калегіяльна (не менш за трох чалавек). Гэта былі і разводы, і справы аб выхаванні непаўналетніх, і далёка не ўсе людзі былі гатовыя казаць пра свае праблемы ў такім публічным фармаце. Нацыянальная мадэль судовага працэсу з тых часоў развілася ў бок прафесіяналізацыі суда і разумнай эканоміі фінансаў і часу на ажыццяўленне правасуддзя. Цяпер большасць спраў разглядаецца судамі першай інстанцыі ў складзе аднаго прафесійнага суддзі. Гэта амаль усе грамадзянскія справы, адміністрацыйныя правапарушэнні, каля дзвюх трацін — крымінальныя. Калегіяльнаму разгляду падлягаюць некаторыя найбольш складаныя катэгорыі крымінальных і грамадзянскіх спраў, а таксама скаргі на судовыя пастановы ў вышэйстаячых судах. У спецыялізаванай судовай калегіі Вярхоўнага Суда аб справах інтэлектуальнай уласнасці некаторыя катэгорыі спраў таксама разглядаюцца трыма прафесійнымі суддзямі як судом першай інстанцыі, настолькі яны складаныя. Таму меркаваная папраўка проста адлюстроўвае гістарычную рэчаіснасць і закладвае ў Асноўны Закон існуючы стан рэчаў. У аснове ўсіх міжнародных судовых рэформаў, што я ведаю, закладзена ідэалагічная трыяда: кампетэнтнасць, эканамічнасць, аператыўнасць.

### АБРАННЕ СУДДЗЯЎ, РОЛЯ УНС І СУМНЕННІ Ў КАНСТЫТУЦЫЙНАСЦІ

***— Цэлы блок паправак прысвечаны функцыям УНС і Канстытуцыйнаму Суду. Між іншым, прадугледжваецца, што «старшыня і суддзі Вярхоўнага Суда выбіраюцца і вызваляюцца ад пасады Усебеларускім народным сходам». Чым абгрунтавана перадача паўнамоцтваў па выбары суддзяў Канстытуцыйнага і Вярхоўнага судоў і вызваленні іх ад пасады УНС?***

— Калі пытанне абрання суддзяў перадаецца найвышэйшаму органу народаўладдзя (УНС), гэта, па-першае, павышэнне адказнасці за выбіраемых людзей перад грамадствам. Па-другое, гэта ўмацоўвае гарантыі незалежнасці суддзяў пры ажыццяўленні правасуддзя. Па-трэцяе, гэта нязменнасць адвольнага складу судоў, таму што абранне будзе публічнай працэдурай. Па-чацвёртае, на УНС, акрамя іншых паўнамоцтваў, ускладзена функцыя гэтага кансаліруючага органа ў сітуацыях, калі беларускае грамадства будзе сутыкацца са знешнімі ці ўнутранымі складанасцямі, у тым ліку з палітычнай нестабільнасцю, таму абранне суддзяў вышэйшых судоў менавіта гэтым органам у няпростай сітуацыі, якая можа скласціся ў краіне, дае дадатковую гарантыю стабільнай работы судовай сістэмы. Гэта асабліва важна ў вострыя перыяды. Нагадаю, што сістэма судоў агульнай юрысдыкцыі штодня выносіць некалькі тысяч розных рашэнняў па канкрэтных справах.

***— Калі пры разглядзе справы «ў суда ўзнікнуць сумненні ў канстытуцыйнасці нарматыўнага прававога акта, які падлягае прымяненню, Суд да прыняцця пастановы ставіць перад Канстытуцыйным Судом пытанне аб праверцы канстытуцыйнасці ўказанага нарматыўнага прававога акта». Навошта такое дапаўненне мяркуюць уключыць у Канстытуцыю? Раней не было сумненняў у адпаведнасці прававых актаў Канстытуцыі?***

— Згодна з Канстытуцыяй, менавіта Канстытуцыйны Суд упаўнаважаны на афіцыйнае тлумачэнне Асноўнага Закона. На маю думку, менавіта з гэтых пазіцый праектам пашыраюцца магчымасці канстытуцыйнага кантролю. Пры гэтым больш дакладна размяжоўваюцца кампетэнцыі судоў агульнай кампетэнцыі і Канстытуцыйнага Суда. Сэнс змены адносна дапаўнення, што ўносіцца, у тым, што суд агульнай юрысдыкцыі не будзе, як цяпер, самастойна інтэрпрэтаваць, ці суадносіцца закон, які павінен прымяняцца ў разглядаемай справе, з Канстытуцыяй. Цяпер, калі суд лічыць, што закон з Канстытуцыяй не суадносіцца, ён абавязаны вынесці рашэнне адпаведна з Канстытуцыяй і толькі потым ініцыіраваць праверку канстытуцыйнасці гэтага закона. Новая рэдакцыя прапануе, каб суд, сутыкнуўшыся з такой сітуацыяй, спыніў разгляд справы і звярнуўся з канстытуцыйным запытам у Канстытуцыйны Суд. У залежнасці ад рашэння апошняга будзе вырашаны далейшы лёс разглядаемай справы. У Вярхоўнага Суда, зрэшты, доўгія гады не было падстаў для сумнення ў канстытуцыйнасці законаў.

***— Яшчэ адна навела, якая прапісана ў Артыкуле 1161, датычыцца ўвядзення канстытуцыйнай скаргі. «Канстытуцыйны Суд у парадку, устаноўленым законам, выносіць рашэнні: па скаргах грамадзян на парушэнні іх канстытуцыйных правоў і свабод, правяраючы канстытуцыйнасць законаў, ужытых у канкрэтнай справе, калі вычарпаны ўсе іншыя сродкі судовай абароны». Мяркуецца, што Канстытуцыйны Суд цяпер будзе найгалоўнейшым?***

— Увядзенне такога інстытута ўпершыню ў гісторыі нашай дзяржавы дазволіць грамадзянам непасрэдна звяртацца ў Канстытуцыйны Суд. Аднак няма падстаў лічыць, што нейкі з найвышэйшых судоў будзе галоўным — яны абодва роўныя. У Канстытуцыі грунтоўна размяжоўваюцца кампетэнцыі Вярхоўнага і Канстытуцыйнага судоў. Суды агульнай юрысдыкцыі не даюць ацэнку заканадаўству на яго адпаведнасць Канстытуцыі, а толькі ініцыіруюць такую праверку. А Канстытуцыйны Суд пры разглядзе скаргаў і канстытуцыйнай адпаведнасці не праводзіць рэвізію пастановы суда агульнай юрысдыкцыі па канкрэтнай справе, таму што высвятленне фактычных абставін судовай справы, прымяненне нормаў права да спрэчкі, высвятленне і абгрунтаванне судовага рашэння — не яго справа. А вось калі судовая справа прайшла ўсе інстанцыі і чалавек звярнуўся па праверку канстытуцыйнасці законаў, якія прымяняліся ў канкрэтнай справе, то дадзенае пытанне Канстытуцыйны Суд і будзе вырашаць. Калі будзе знойдзена неадпаведнасць — гэта стане падставай для перагляду справы. Увогуле, усе прапанаваныя змяненні маюць на мэце забяспечыць баланс у галіне дзяржулады, каб яна магла эфектыўна працаваць.

**Ірына СІДАРОК.**

**ПОЎНЫ ТЭКСТ КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ СА ЗМЯНЕННЯМІ І ДАПАЎНЕННЯМІ, ЯКІЯ ВЫНОСЯЦЦА НА РЭФЕРЭНДУМ, — У НУМАРЫ «ЗВЯЗДЫ» ЗА 22 СТУДЗЕНЯ І НА САЙЦЕ ZVIAZDA.BY**

**Плеяда маладых — рубрыка «Звязды», у якой будзем расказваць пра новае пакаленне лідараў Беларусі.**

# «У МАІМ ЛЁСЕ ЁСЦЬ ПЭЎНАЯ ДОЛЯ ЎДАЧЫ»

**Герой нашай рубрыкі — першы намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю Іван ВЕЖНАВЕЦ. Мара юнацтва калісьці прывяла яго на дзяржслужбу, а ўжо ў 30 гадоў ён заняў пасаду намесніка міністра. Чаму работа ў МАРГ часам падобная да дэтэктыва, да чаго павінен імкнуцца кожны чыноўнік і чаму ў рабоце з пчоламі не важны мёд, чытайце ў першым інтэрв'ю рубрыкі «Плеяда маладых».**



***— Вы скончылі Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Чаму выбралі гэтую ВНУ і што вас падштурхнула ісці ў дзяржслужбу? Магчыма, вашы бацькі былі кіраўнікамі?***

— Я вырас у звычайнай сям'і. Мая мама працавала эканамістам, тата — кіроўцам. Ніякай працоўнай дынастыі няма. Я вырашыў пайсці вучыцца ў Акадэмію кіравання школьнікам. Нарэшце гэтага ў мяне ёсць своеасаблівая гісторыя. Але яшчэ не гатовы яе расказваць.

**Прынцып па жыцці: «Не вер, не бойся, не прасі».**

***— Намякніце хоць бы, з чым яна звязаная?***

— Са школьнымі спрэчкамі наконт таго, як павінна жыць дзяржава. У выніку такіх размоў я вырашыў паспрабаваць зрабіць нешта добрае для сваёй краіны. Для гэтага вырашыў звязаць жыццё з дзяржаўнай службай. Гучыць вельмі моцна, але гэта была мая ідэя з дзяцінства. У пачатку 2000-х паступіць адразу пасля школы ў Акадэмію кіравання лічылася амаль немагчымым. Мне пашчасціла: Акадэмія кіравання ўжо некалькі гадоў набірала выпускнікоў школы. Здаў ЦТ, паступіў на бюджэт лёгка, бо меў добрыя балы на іспытах, хоць конкурс і быў вялікі.

***— Доўга рыхтаваліся?***

— Памятаю, год дакладна хадзіў да рэпетытара. Вучыўся я ў гімназіі, і ў мяне была добрая база па замежнай мове. Матэматыка таксама добра ішла. Неабходна было падцягнуць рускую мову, таму хадзіў да рэпетытара.

***— Чым запомніліся студэнцкія гады?***

— У першую чаргу атмасферай узаемнага даверу, сяброўства, што пануе ў студэнцкім калектыве. З хлопцамі, з якімі я дзяліў пакой у інтэрнаце, вучыўся на курсе, часта сустракаюся. Наша кампанія захавалася праз гады — маем цесныя кантакты, дапамагаем адзін аднаму парадай, падтрымліваем у пачынаннях.

Акадэмія навучыла ладзіць адносіны, знаходзіць агульныя інтарэсы. Большасць з тых, з кім са сваіх сакурснікаў я сёння камунікую, пабудавалі добрую кар'еру. Таксама са студэнцкіх часоў я вынес тэзіс, які ў той час быў дэвізам ВНУ, — «адукацыя праз усё жыццё». Гэта значыць, нельга супакойвацца на дасягнутым, заўсёды неабходна адкрываць нешта новае.

***— Як пачаўся ваш шлях па кар'ернай лесвіцы? Першае месца працы — Камітэт эканомікі Мінгарвыканкама...***

— На апошніх курсах мэтанакіравана спрабаваў знайсці першае месца працы. Трапіў на практыку ў Камітэт эканомікі. Там займаўся цікавай сферай — кіраваннем інвестыцыямі. У той час горад актыўна працаваў з замежнымі інвестарамі, дагаворы пачыналі заключацца. Мне гэта падабалася. Супрацоўнікі, якія ўзялі мяне на практыку, таксама зацікавіліся мной і прапанавалі размеркавацца да іх. У далейшым лёсе ёсць пэўная доля ўдачы, шанцавання. Інвестыцыі былі складаным кірункам. Спецыялістаў, што займаліся іх прыцягненнем з-за мяжы, у галіне было не так шмат. Патрэбны былі веды і ў эканоміцы, і ў юрыспрудэнцыі, і замежная мова, і дзелавая камунікацыя — усё, чаму навучыўся ў Акадэміі кіравання. Я праявіў сябе спецыялістам і атрымаў прасоўванне па кар'ернай лесвіцы. Дзесьці за тры гады з вядучага спецыяліста дарос да намесніка начальніка ўпраўлення ў Камітэце эканомікі. Пасля працаваў у Апараце Савета Міністраў. Займаўся спачатку кіраваннем дзяржаўнай маёмасцю, пасля прагнозам сацыяльна-эканамічнага развіцця, пазней узначаліў крэдытна-інвестыцыйнае ўпраўленне. Затым мне ўжо прапанавалі месца намесніка міністра.

***— Колькі вам было ў той час гадоў?***

— Каля 30.

***— Як вы адрэагавалі на прапанову: адразу ўхапіліся за магчымасць ці разважалі?***

— З Уладзімірам Калтовічам (былы кіраўнік МАРГ. — **«Зв.»**) я быў знаёмы па рабоце ў гарвыканкаме, ды і ў Савеце Міністраў таксама перасякаліся. Калі яго прызначалі міністрам, ён патэлефанаваў і сказаў: «Іван, давай цябе ўключым у рэзерв кіруючых кадраў на пасаду намесніка міністра». Ад рэзерву ніхто ніколі не адмаўляецца, але пасля пасаду не заўсёды прапануюць. Не прайшло і месяца, як мне званіць Уладзімір Васільевіч і кажа: «Усё, Іван, афармляйся». Я пытаю: «Куды афармляцца?» — «Пойдзеш на пасаду намесніка міністра». Сфера для мяне была новая, але вырашыў не адмаўляцца: такі шанц даецца не заўсёды.

***— Вы, па сутнасці, з'яўляецеся другой асобай у МАРГ. За якую сферу дзейнасці ведамства адказваеце?***

— Антыманапольнае рэгуляванне і рэгуляванне ў сферы натуральных манаполій.

***— А калі болей падрабязна, каб радавы чытач зразумеў...***

— Асноўная задача антыманапольнага рэгулявання — з эканамічнага погляду суб'екты павінны быць у роўных умовах і падтрымліваць прынцыпы канкурэнцыі. Я адной чы ўдзельнічаў у акцыі Міністэрства адукацыі «ШАГ — Школа актыўнага грамадзяніна», у рамках якой чыноўнікі наведваюць школы, сустракаюцца з вучнямі і расказваюць пра сваю работу. Калі я тлумачыў дзецям, што такое канкурэнцыя, на адной частцы дошкі маляваў дрэва — адно вялікае, раскідзістае, на другой — тры высокія, роўныя. Пытаюся, якое лепшае. Усе адказваюць — першае. А калі паглядзець з боку эканомікі і з усіх дрэў прыбраць галінкі? Атрымліваецца, што лепшымі будуць тры доўгія і роўныя — з іх атрымаецца больш драўніны. І я падводжу, што манаполія — гэта адно дрэва, якое забірае ў сябе ўсе рэсурсы. Яно прыгожае, але эканамічнага эфекту няшмат. А калі гэтых дрэў тры, яны ў лесе і імкнуцца да святла, то эканамічна мы дасягаем таго, што рэсурс выкарыстоўваецца больш эфектыўна. Вось гэта мая задача і ўсяго ведамства — ствараць умовы для здаровай, сумленнай канкурэнцыі і атрымліваць эфект ад рэсурсаў.



Падчас падарожжа па лесе.

***— Увогуле, якія мэты стаяць перад МАРГ цяпер?***

— Ключавая задача — кантроль за цэнаўтварэннем, сумленныя цэны для спажыўца і прадпрыемстваў. Зараз ва ўмовах пандэміі мы гэту задачу вырашаем у кароткачасовым перыядзе. Да 2020 года вырашалі больш далёкімі інструментамі — развіццём канкурэнцыі. Ва ўмовах пандэміі ўзрастаюць рызыкі злоўжывання: прапаноў тавару менш, граніцы закрыты. Мы перайшлі да больш жорсткага кантролю цэн. Спачатку ўвялі абмежаванне па тэмпе прыросту цэн, цяпер — гранічныя цэны на плодаагародніннную прадукцыю (гэта самае жорсткае рэгуляванне, што можа быць прыменена). Гэта часовыя меры, што накіраваны на стабілізацыю цэн. Доўгатэрміновая задача — развіццё канкурэнцыі, каб цэны былі збалансаванымі і сумленнымі інструментамі канкурэнцыі і антыманапольнага рэгулявання.

***— Чым вам цікавая работа ў міністэрстве? Якія ў ёй плюсы і мінусы?***

— Самы галоўны плюс — рознабаковая накіраванасць. Тут неабходна ведаць і эканоміку, і юрыспрудэнцыю, заканадаўчую базу. Ёсць і доля творчасці на дзяржаўнай службе. Любое антыманапольнае расследаванне нестандартнае, асабліва калі гэта датычыцца картэльнай змовы.

**«Нельга супакойвацца на тым, чаго дасягнуў, — заўсёды неабходна адкрываць нешта новае».**

***— Картэльная змова — нешта з дэтэктыва...***

— Такі невялікі дэтэктыў у лакальным маштабе, дзе мы павінны даказаць, што ёсць нефармальная змова, без прапісанай дамовы. Так, на таргах яны могуць падзяліць лот на часткі. Любы разумны эканамічны суб'ект не супакоіцца на пэўнай кропцы прапаноў, што будзе роўны прапанове яго канкурэнта. Ён зробіць наступную стаўку, каб забраць лот поўнасцю сабе. У такіх выпадках неабходна даказаць, што была загадзя дамова, каб лот падзяляць пароўну. Тут неабходна праявіць творчасць у пошуку доказаў, каб выйграць справу ў судзе.

***— Вы — прадстаўнік новага пакалення кіраўнікоў. Якія якасці павінен мець малады чалавек, каб дасягнуць значнай пасады?***

— Мне спадабалася фраза аднаго калегі-настаўніка, якую я інтэрпрэтаваў па-свойму. Да чаго павінен імкнуцца кожны чыноўнік — «Не вер, не бойся, не прасі». Першае — «не вер». Нельга нікому верыць на слова. Кожнае тваё рашэнне павінна быць аналітычным, фактычна абгрунтаваным і вывераным. Другое — «не бойся». Не бойся прымаць рашэнні. Калі ты ўсё праверыў, пракансультаваўся, абмеркаваў з іншымі, тады не бойся прымаць рашэнне. Непрыняцце рашэння часам горшае, чым прыняцце няправільнага. Калі рашэнне няправільнае, не бойся яго змяніць — кожны мае права на памылку. Трэцяе — «не прасі». На дзяржслужбе працуеш на карысць дзяржавы і людзей, не прасі нічога для сябе.

***— Які вы кіраўнік?***

— Вельмі мяккі. Калі мяне калегі віншуюць з днём нараджэння, нават жадаюць быць больш жорсткім. Кажуць: «Іван Валер'евіч, вы з намі вельмі мяккі». Я заўсёды даю людзям права на памылку. Я прыхільнік не пошукаў вінаватых, а выпраўлення сітуацыі. Нават з такім стылем кіраўніцтва можна вырашыць усе складанасці.

***— Чым вам прыходзіцца ахвяраваць дзеля работы? Магчыма, вы заўзяты лыжнік, але з-за недахопу часу не можаце сабе дазволіць гэта?***

— Я люблю лыжы. Часам сабрацца на лыжню не хапае сіл. Трэба паехаць дамоў, пераапрануцца, павячэраць, а потым ужо не вельмі і хочацца. Падзялюся з вамі: я займаюся пчоламі. Ды мне не столькі важны вынік — мёд, колькі працэс. Мне цікава паехаць у лес, знайсці паваленую сасну, выпісаць яе ў лягасе, дома распілаваць, зрабіць з яе вулей і пасадзіць туды пчол. Так з нічога — сухой, паваленай сасны — робіш нешта карыснае.

***— Вы ў нашай размове ўжо казалі пра ўдачу. Як лічыце, поспех у прафесіі — шчаслівы выпадак ці ўпартая праца?***

— Гэта нешта паміж. Адна ўдача не дапаможа, калі ты не ідзеш да мэты і не рыхтуеш сябе. Калі б я проста захацеў працаваць на дзяржслужбе і не рабіў дзеянні, то нічога б не дасягнуў.

***— Ці хапае ў вас часу на сям'ю?***

— Лічу, што хапае. Жонка, верагодна, лічыць, што не.

***— Калі б стаў выбар паміж кар'ерай і сям'ёй, што б выбралі?***

— Зараз скажу, што сям'ю. Калі давядзецца выбіраць, не ведаю...

**Марыя ДАДАЛКА.**
**Фота БелТА і з архіва героя.**

# ГАНДЛЯРЫ СТРАХАМ



## Куды рушыць Украіна?

**Аб'ёмы паставак зброі і ваеннага абсталявання Украіне з боку Захаду за апошні час перавысілі тысячу тон. Аб гэтым заявіў міністр замежных спраў краіны Дзмітрый Кулеба, паведаміла агенцтва «Укрінфарм». «Украіна атрымлівае ўзмоцненую палітычную і эканамічную дапамогу, а таксама падтрымку ў сферы бяспекі. Яе агульны аб'ём за гэтыя тыдні і месяцы перасягнуў адзнаку 1,5 мільярда долараў», — падкрэсліў міністр. Раней Кулеба адзначаў, што ваенную дапамогу Кіеву аказалі ЗША, Вялікабрытанія, Польшча, Літва, Латвія і Чэхія. Таксама Украіна актыўна фарміруе добраахвотніцкія тэрытарыяльныя батальёны (у адпаведнасці з законам «Аб нацыянальным супраціўленні», які ўступіў у дзеянне з пачатку 2022-га). Іх колькасць апублікаваў амерыканскі часопіс Foreign Policy. Усяго плануюць сфарміраваць 25 добраахвотніцкіх брыгад і 150 узброеных батальёнаў з грамадзянскага насельніцтва. Гэта 130 тысяч чалавек, падлічыла FP. Такія захады выглядаюць асабліва трывожна на фоне шырокамаштабнай інфармацыйнай істэрыі, якая ўзмоцнена разгортваецца вакол Украіны. Дзяржава-суседка імкліва мілітарызуецца і стварае пагрозу не толькі рэгіянальнай, але і глабальнай бяспецы. Куды ж рушыць Украіна?**

### ПЛАЦДАРМ ДЛЯ ЖАХЛІВАГА ЭКСПЕРЫМЕНТА

Захаду выгадна падтрымліваць крызіс на Украіне ў актыўнай фазе, каб ператвараць краіну ў рынак збыту зброі і пляцоўку для інвестыцыйных махінацый, лічыць аўтар партала «Страна.ua» Дзмітрый Співак. Ён адзначыў, што ЗША і Вялікабрытанія сваімі дзеяннямі вымушаюць бізнесменаў уводзіць актывы і вытворчасць з Украіны з-за пастаяннага страху абвастрэння канфлікту, а таксама апошнім часам з-за чутак аб расійскім «уварванні». «Яны далі выразны сігнал інвестарам неадкладна выводзіць грошы і пакідаць гэтую тэрыторыю. І інвестары іх пачулі. Грошы сталі вокамгненна сыходзіць. Разам з інвестыцыямі. А значыць, у сукупнасці з агульным сусветным крызісам і цаной на газ, з-за якой спыняюцца прадпрыемствы некалькіх галін, эканоміка нашай краіны каля краю прорвы», — піша Співак.

Аўтар матэрыялу нагадаў, што заходнія партнёры аказваюць Украіне дапамогу не на незваротнай аснове. «Яны гуляюць у свае гульні, пікіруюцца з Расіяй і выдатна зарабляюць на крызісах, якія самі ствараюць, і пастаўках зброі ў крэдыт для выхаду з гэтага крызісу... Украіна стала выдатным плацдармам для гэтага жахлівага эксперымента. Як кажуць, нічога асабістага. Толькі бізнес», — рэзюмаваў Співак.

Акадэмік НАН Украіны Уладзімір Семіножанка ў эфіры тэлеканала «Наш» распавёў, што зараз «гандляры страхам» спекулююць сітуацыяй вакол Украіны, палохаючы вайной увесь свет і зарабляючы на гэтым вялізныя грошы. «Пужаюць вайной не толькі Украіну, але і Еўропу, і свет. Самы выгадны міжнародны бізнес — гэта продаж страху. Калі наша насельніцтва напалохана, яно бяжыць купляць долары. Калі людзі напалоханыя, павышаюць цэны на газ. Мы пераплачваем за газ вялізныя сродкі. Еўропа напалохана, пачынаючы патрабаванні да членаў НАТА рабіць больш укладанняў у агульны натаўскі кашалёк. Крыніцы страху зарабляюць на гэтым вялікія грошы», — заявіў эксперт.

### ГАРМАТНАЕ МЯСА

Зараз наўрад ці нехта ў краіне думае, што прэзідэнт Украіны Уладзімір Зяленскі самастойна кіруе дзяржавай, паколькі ўсе яго дзеянні — вынік знешняга ўплыву. Пра гэта заявіў старшыня палітсавета партыі «Апазіцыйная платформа — За жыццё» народны дэпутат Віктар Медвядчук у інтэрв'ю тэлеканалу UkrLive. Апазіцыйны палітык дадаў, што знешняе кіраванне — палітыка каланізацыі.

Актывізаваўся і Лондан. Савет па геастратэгіі Вялікабрытаніі заявіў у сваім «Твітэры», што міністр замежных спраў Ліз Трас



разглядае магчымасць з'яўлення трохбаковага пакта паміж Лонданам, Варшавай і Кіевам. Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства пацвердзіла, што Злучанае Каралеўства развівае новыя трохбаковыя сувязі з Польшчай і Украінай. Украінскі палітолаг Канстанцін Бандарэнка заявіў «Страна.ua», што Лондан выношвае планы па маштабнай змене Еўропы. «Брытанія робіць заяўку на ролю самастойнага гульца, а не проста малодшага партнёра ЗША. Яна падбірае ўсе тыя кавалкі былога Pax Americana, якія па нейкіх прычынах сталі клопатам для Штатаў, і выбудоўвае ўласны Pax Brittanica», — падзяліўся меркаваннем эксперт.

Паводле меркавання эксперта, архітэктарам гэтага альянсу называюць Рычарда Мура, шэфа разведвальнай службы МІ6 і былога пасла Вялікабрытаніі ў Турцыі. «Нічога добрага Украіне гэта не прынясе — нам і надалей прыгатаваная роля гарматнага мяса ў вялікім перадзеле Еўропы і свету. Калі амерыканцы — гэта суперпрагматыкі, то брытанцы — суперцынікі, як паказвае гісторыя», — падсумаваў палітолаг.

У магчымым альянсе з Вялікабрытаніяй і Польшчай Украіне адведзена зневажальная роля, а сам саюз стане фіктыўным палітычным аб'яднаннем. Пра гэта заявіў украінскі палітолаг Міхаіл Паграбінскі ў эфіры інтэрнэт-канала «Першы казацкі». Палітолаг лічыць, што ўсе краіны-ўдзельніцы маюць у гэтым альянсе свае мэты. Вялікабрытанія хацела б «узяць лейцы супердзяржавы», якія вось-вось выпусціць ЗША, а Польшча павышае значнасць «ва ўласных вачах». Украіну разглядаюць як «раздражняльны фактар Расіі». Кіеў, у сваю чаргу, плануе прымаць высокапастаўленых гасцей, бо для прэзідэнта Украіны Уладзіміра Зяленскага няма нічога важнейшага, чым «пакрасавацца» на міжнароднай арэне, заключыў Паграбінскі.

### КОЗЫР ДА ВЫБАРАЎ

Заходнія палітыкі штучна ствараюць ваенную напружанасць на тэрыторыі Украіны, расказваючы ў сваіх СМІ пра нібыта немінучае ўварванне ворага. Аб гэтым заявіў у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» украінскі і расійскі палітолаг, гісторык і журналіст Уладзімір Карнілаў. «Я гэтага піку канфлікту чакаю ўжо з лістапада. Нам абвяшчалі, што Пуцін нападзе да Новага года. Потым нам заявілі, што глеба недастаткова прамерзла для расійскіх танкаў — чакаюць, калі рэкі лёдам пакрыюцца. Вы ўяўляеце, шматтонны танк ідзе па лёдзе ракі. Гэта наогул уявіць можна? Але на поўным сур'ёзе паўтаралі заходнія СМІ. Пасля пайшлі заяўляць, што пік уварвання прыйдзецца на кітайскую Алімпіяду», — сказаў Уладзімір Карнілаў.

Палітолаг падкрэсліў, што так можна бясконца прыдумляць нагоды. «Украінцы моляць амерыканцаў спыніць гэту істэрыку, заяўляючы, што цяперашняя колькасць расійскіх падраздзяленняў на тэрыторыі Расіі, якія можна нейкім бокам залічыць у зоны прыгранічнай Украіны, нічым па колькасці не адрозніваецца ад таго, што назіралі ў пачатку вясны мінулага года, — падкрэсліў Уладзімір Карнілаў. — Украіна пакутуе ад таго, што ў выніку гэтай панікі выводзяць грашовыя сродкі, капіталы, бізнес згортваюць і гэтак далей. Гэта значыць, што калі ўжо Украіна не бачыць пагрозы, то якія прэтэнзіі наогул могуць быць да Расіі».

Больш за ўсё ва Украіне вайсковую істэрыю нагнятаюць Злучаныя Штаты Амерыкі. Аб гэтым заявіў на тэлеканале «Беларусь 1» украінскі палітолаг Васіль Вакараў. «Злучаныя Штаты Амерыкі праз сродкі масавай інфармацыі з канца кастрычніка гавораць аб тым, што Расія павялічыла кантынгент сваіх войскаў на працягу ўсёй граніцы з Украінай. Тут разыходзіцца наша, украінская, афіцыйная пазіцыя з амерыканскай. Украіна кажа аб тым, што нічога новага, пачынаючы з сакавіка—красавіка мінулага года, не адбываецца. Амерыканцы сцвярджаюць, што мы чагосьці не бачым», — заўважыў Васіль Вакараў.

Ваенная істэрыя вакол Украіны, якая раздзімаецца Вашынгтонам, на думку экспертаў, можа быць звязана з маючымі адбыцца гэтай восеннню прамежкавымі выбарамі ў Кангрэс ЗША, якія могуць вызначыць лёс кіруючай Дэмакратычнай партыі на чале з Джо Байдэнам і паўплываць на абранне наступнага прэзідэнта, заўважыла «Страна.ua». Украінскую карту, лічыць частка экспертаў, у Белым доме могуць выкарыстоўваць як козыр у выбарчай кампаніі, на фоне нарастаючых унутраных праблем і гучнага правалу ў Афганістане.

Галоўны рэдактар японскага выдання Nikkei Asia Шыгесабура Акумура, які прадказаў дэмакратам «балючае паражэнне», лічыць, што Вашынгтон спрабуе стварыць вобраз «бязлітаснага і няўмольнага знешняга ворага», у прыватнасці, з-за няздольнасці вырашыць унутраныя праблемы.

### ГОРКАЯ АРЫФМЕТЫКА

Рэжым, які знаходзіцца пад кантролем заходніх краін на працягу васьмі гадоў, здолеў зламаць



дух украінскага народа. Такім меркаваннем у сваім тэлеграм-канале падзяліўся дэпутат Вярхоўнай Рады ад партыі «Апазіцыйная платформа — За жыццё» Ілья Ківа. «Механізм адладжаны да дробязяў, каго запалохвалі, каго забівалі, а каго крымінальным пераследам прымушалі ўцякаць з краіны», — растлумачыў ён. Па словах палітыка, Захад зладзіў на Украіне сапраўдны генацыд, дазволіўшы нацыстам беспакарана чыніць беспарадак і раскрадаць краіну. У выніку ўкраінцы маўчаць і сядзяць па дамах, «насычаныя страхам», заключыў Ківа.

Адметныя вынікі апытання аб узаемным успрыманні Беларусі і Украіны, якое было праведзена аналітычным цэнтрам EcooM сумесна з фондам «Украінская палітыка». Высветлілася, што добра да Беларусі ставіцца каля паловы рэспандэнтаў, нейтральна — трэць. Украінцы разглядаюць Беларусь галоўным чынам як «проста суседа». Дружалюбнай дзяржавай яе лічаць 19 працэнтаў, брацкай краінай — 17 %, стратэгічным партнёрам — 4 %. Варта адзначыць, што атрыманыя даныя абвяргаюць негатыўныя ацэнкі ангажаваных СМІ і сацыялагічных службаў.

Беларусы да ўкраінцаў ставяцца лепш. Украіну пазітыўна ўспрымаюць большасць беларускіх рэспандэнтаў (70 працэнтаў). Добрымі і добрасуседскімі адносіны дзвюх краін лічаць 30 працэнтаў. Чаканні іх паляпшэння звязаны з развіццём супрацоўніцтва ў гандлёвай, вытворчай і фінансавай сферах. У той жа час больш за палову беларусаў не лічыць украінскі вопыт добрым прыкладам. Не ўхваляюць нашы грамадзяне і збліжэнне Украіны з Захадам. Большасць беларусаў (каля 60 %) лічылі б мэтазгодным рух суседняй краіны ў бок Саюзнай дзяржавы або захаванне яе нейтралітэту.

Вынікі палітычных гульняў несуцяшальныя: адбываецца катастрафічнае пагаршэнне ўзроўню жыцця людзей. Напрыклад, днямі стала вядома, што ва Украіне цэны на хлеб выраслі да рэкордна высокіх адзнак за апошнія пяць гадоў. Прычым даражэюць не толькі хлебабулачныя вырабы, але і іншыя прадукты. Напрыклад, цэны на алей за год выраслі на 85,5 працэнта і, згодна з меркаваннем экспертаў, працягнуць расці. «Набор для баршчу» падаражэў у два разы. Затое ўзбраення на $1,5 млрд набралі. Вось і ўся арыфметыка.

**Пётр ДУНЬКО.**

### Даслоўна

## «Сітуацыя падаграваецца фэйкамі і чуткамі»

**Аб гэтым заявіў у эфіры тэлеканала АНТ Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ.**

Дзяржсакратар заклікаў паглядзець, што адбываецца сёння на тэрыторыі Украіны, якую відавочна падштурхоўваюць, абвастраюць абстаноўку. «Розныя фэйкі выкарыстоўваюць, чуткі. Падаграваюць гэтую абстаноўку, правакуючы сітуацыю, — адзначыў Аляксандр Вальфовіч. — Паводле маёй інфармацыі, зараз у Міністэрстве абароны Украіны прысутнічае каля пяці-шасці саветнікаў стратэгічнага ўзроўню — ваенных саветнікаў, а на аператыўным узроўні — больш за 64 такіх саветнікаў. Гэта значыць, відавочна амерыканскія саветнікі дыктуюць, як жыць, як будаваць Узброеныя сілы, чым займацца і што рабіць. Тыя грошы, якія ўкладваюць сёння амерыканцы ў будаўніцтва і развіццё Узброеных сіл Украіны, калі так можна назваць, дазваляюць ім дыктаваць умовы і знаходжанне такой колькасці саветнікаў на тэрыторыі іншай дзяржавы. І гэта, напэўна, сведчыць само за сябе».

Мы павінны быць гатовы адэкватна адказаць на ўсе рызыкі і выклікі. «Я яшчэ не кажу аб пагрозах. Не хацелася б пераходзіць да гэтага тэрміна. Таму міжволі згадваецца старажытная рымская прымаўка: хочаш міру — рыхтуйся да вайны», — заўважыў Аляксандр Вальфовіч.

# СЕНСАЦЫЯ З БІЯЭТЫЧНАЙ КАЛІЗІЯЙ

## Аперацыя па перасадцы свінога сэрца чалавеку дала надзею сотням тысяч людзей па ўсім свеце

**Прызнайцеся, ці пагадзіліся б вы на перасадку вам свінога сэрца? А вось Дэвід Бенет пагадзіўся: 57-гадовы амерыканец стаў першым у свеце чалавекам, якому перасадзілі сэрца геннамадыфікаванай свінні. Спецыялісты з медыцынскага цэнтра Універсітэта Мэрыленда атрымалі ад улад спецыяльны дазвол на аперацыю, растлумачыўшы, што без яе іх пацыент не выжыве. З-за некантралюемай арытміі ён таксама не мог разлічваць і на часовую меру — механічны імплант, які часткова выконвае функцыю сэрца.**

**«Для мяне выбар быў паміж смерцю і гэтай перасадкай, — сказаў 57-гадовы Бенет напярэдадні аперацыі. — Я разумею, што далейшы мой лёс абсалютна невядомы, але для мяне гэта апошні шанц».**

### У ЛІСЦЕ ЧАКАННЯ

Для хірургаў аперацыя стала вынікам шматгадовых даследаванняў. Яны спадзяюцца, што іх поспех дапаможа выратаванню жыццяў мноства людзей па ўсім свеце. У сваёй заяве Універсітэт Мерыленда цытуе хірурга Бартлі Грыфіта, па словах якога аперацыя заклікана «наблізіць вырашэнне крызісу з недахопам донарскіх органаў». Эксперты прадказваюць, што ўжо ў найбліжэйшыя 20-30 гадоў ксенатрансплантацыя ўвойдзе ў штодзённую ўрачэбную практыку. І вопыт Дэвіда Бенета наблізіў чалавецтва да новай эпохі міжвідавога донарства. Наколькі хутка яна наступіць, залежыць ад таго, наколькі доўга будзе біцца яго новае сэрца.

Між іншым, прарыў у сферы трансплантацыі і перасадка сэрца свінні чалавеку ўзнімае адразу некалькі важных аспектаў — гэта і прадузятасць у адносінах да ксенатрансплантацыі, і права жывых істот не быць ахвярамі навукі на карысць чалавецтва. Для многіх перасадка органаў ад жывёл да чалавека выглядае абсурдна, амаральна і ўступае ў супярэчнасць з рэлігійнымі перакананнямі. Гэтыя і іншыя праблемы аказаліся ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў дыскусіі, арганізаванай Рэспубліканскім цэнтрам біяэтыкі. Найважнейшая задача, якая ставіцца перад біяэтыкай, — спрыяць выяўленню розных пазіцый па найскладанейшых маральных праблемах, якія лавінападобна цягне за сабой прагрэс біямедыцынскай навукі і практыкі.

— Свет, вядома, не ляціць у бездань, але падобныя навуковыя эксперыменты патрабуюць пільнай увагі і сур'ёзнага абмеркавання з удзелам спецыялістаў з розных галін, — канстатуе **кіраўнік цэнтра, дацэнт кафедры грамадскага здароўя і аховы здароўя БелМАПА Валерыя САКОЛЬЧЫК**. — Ксенатрансплантацыя ставіць фундаментальную этычную праблему: ці з'яўляецца чалавек найвышэйшай каштоўнасцю, у імя якой можна прычыняць пакуты і быць прычынай смерці іншых жывых істот?

— Перасадка чалавеку сэрца генетычна мадыфікаванай свінні — гэта наватарская працэдура, якая не проста дае надзею сотням тысяч пацыентаў ва ўсім свеце на працяг жыцця, але і чарговая спроба зрабіць крок наперад у сферах трансплантaлогіі, імуналогіі, кардыялогіі і іншых сумежных сферах, якія адна без адной існаваць не могуць — разважае **ўрач-хірург Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, трансплантaлогіі і гематалогіі Яўген КОТАЎ**. — Калі звярнуцца да гісторыі, то першую трансплантацыю сэрца ад жывёлы чалавеку зрабіў у 1964 годзе Джэймс Хардзі. Рэцэпіент пражыў з сэрцам шымпанзэ ўсяго паўтары гадзіны. А першую ўдалую перасадку чалавечага сэрца здзейсніў у 1967 годзе Крысціян Барнард. Пасля трансплантацыі пацыент пражыў толькі 18 дзён і памёр ад двухбаковай пнеўманіі.

З тых часоў трансплантaлогія прасунулася далёка наперад. Толькі ў Беларусі выканана ўжо больш як 450 аперацый па трансплантацыі донарскага сэрца. Трансплантацыя сэрца — гэта фінальная стадыя лячэння хранічнай сардэчнай недастатковасці, калі медыкаментозным ці хірургічным метадам пацыенту ўжо не дапамагчы.

Для многіх хворых з сардэчнай паталогіяй трансплантацыя застаецца адзіным шанцам на выратаванне. Відавочна, што патрэба ў донарскіх органах намнога большая, чым колькасць здзейсненых перасадак. Востры дэфіцыт донарскіх сэрцаў прыводзіць да таго, што колькасць рэцыпіентаў у лісце чакання на такую аперацыю расце. І з кожным годам праблема абвастраецца. Толькі ў ЗША, дзе дзейнічае развітая праграма па трансплантацыі сэрца, у лісце чакання знаходзіцца больш за 100 тысяч пацыентаў, і кожны дзень паміраюць у сярэднім 16-17 чалавек, якія так і не дачакаліся аперацыі. А новае сэрца атрымліваюць за год 4 тысячы чалавек.

### ЦУДЫ ГЕННАЙ БІЯІНЖЫНЕРЫІ

Па словах Яўгена Котава, сур'ёзную праблему пры трансплантацыі складае рызыка вострага і хранічнага непрымання донарскага органа, нават нягледзячы на наяўнасць усё больш сучасных схем імунасупрэсіўнай тэрапіі. Гэта лячэнне накіравана на падаўленне імунітэту рэцыпіента і прафілактыку непрымання донарскага органа. А пры ксенатрансплантацыі праблема стаіць яшчэ больш востра. Над пераадоленнем ксенаімуналагічнай несумяшчальнасці працуюць вядучыя трансплантолагі свету. Тут вялікую ролю іграюць фенагенетыка і філагенетычная блізкасць паміж донарам і рэцыпіентам. І бліжэй за ўсіх да нас стаяць вышэйшыя прыматы. А вось трансплантацыя ад свінні з'яўляецца філагенетычна далёкай і характарызуецца надзвычай высокімі рызыкамі звышвострага і вострага непрымання донарскага органа, нават нягледзячы на самыя сучасныя метады імунасупрэсіі. Як жа ўдалося вырашыць дадзеную праблему падчас аперацыі Дэвіду Бенету?

— Дзякуючы геннай біяінжынерыі ў спалучэнні з сучаснымі схемамі імунасупрэсіі, — тлумачыць Яўген Котаў. — Парсюк, які стаў донарам, меў 10 генетычных мадыфікацый. У яго былі інактываваныя («выключаныя») чатыры гены, у тым ліку ген, які адказвае за звышхуткую рэакцыю непрымання свінога трансплантата арганізмам чалавека, а таксама быў інактываваны ген росту кардыяміяцытаў, каб сэрца свінні не працягвала расці ў грудзі рэцыпіента пасля праведзенай яму трансплантацыі. Акрамя таго, у геноме свінні-донара былі ўкаранёныя шэсць генаў чалавека для дасягнення большай талерантнасці (падобнасці) з імуннай сістэмай чалавека. І ў дадатак да генных мадыфікацый быў выкарыстаны эксперыментальны імунасупрэсіўны прэпарат для пераадолення ксенанепрымання.

### ВЫБАР — НА КАРЫСЦЬ ЧАЛАВЕКА?

Дык чаму ўсё ж такі выбар спыніўся на свіннях? У 2019 годзе іх пагалоўе на планеце складала 1,5 мільярда асобін. Свіней лёгка вырошчваць, адносна танна ўтрымліваць. Многія людзі прымаюць факт вымання донарскіх органаў у свіней больш спакойна, паколькі апошніх усё роўна вырошчваюць як крыніцу харчавання для чалавека, а свіння вырастае да дарослай асобіны ўсяго за шэсць месяцаў.

Але **дацэнт кафедры судовай медыцыны БДМУ, супрацоўнік Рэспубліканскага цэнтра біяэтыкі Ганна КЛІМОВІЧ** такую пазіцыю не падзяляе: «Для мяне мае значэнне жыццё любой жывой істоты. І я стаю на пазіцыях біяцэнтрызму. Доўгі час чалавек супрацьпастаўляўся ўсім астатнім істотам на зямлі, і лічылася абсалютна натуральным, што толькі яго інтарэсы і патрэбы важныя, а ўсе астатнія істоты не маюць самастойнай каштоўнасці. Калі мы кажам аб экалагічнай парадыгме, то павінны жыць у міры з усім навакольным светам. А калі навучымся цаніць жыццё іншых істот, магчыма, мы больш даведаемся і пра сябе. Я асабіста да ксенатрансплантацыі не гатовая».

— Мы з вамі разважаем пра гуманнасць са сваёй пазіцыі. А паспрабуйце паставіць сябе на месца пацыента, які ведае, што без донарскага органа яму засталося жыць лічаныя месяцы, — прапанаваў Яўген Котаў. — Сёння распрацаваны алгарытмы падліку прагназаванай працягласці жыцця, якія дазваляюць вельмі дакладна пралічыць, колькі засталося жыць такім пацыентам. І калі кантактуеш з імі, узнікае вострае жаданне дапамагчы ўсімі даступнымі на сённяшні дзень спосабамі. Вядома, пры ксенатрансплантацыі трэба ўзважваць усе «за» і «супраць», але гэта ўсё ж такі важны крок у будучыню да развіцця новых тэхналогій. Трэба шукаць і іншыя спосабы вырашэння праблемы. Пакуль што нажніцы паміж колькасцю донараў і людзей, якія чакаюць трансплантацыю, растуць. Хворыя працягваюць паміраць, знаходзячыся ў лісце чакання. У Беларусі ліст чакання таксама вялікі, а колькасць донараў абмежаваная.

— Калі мы кажам пра донараў-людзей, то ў нашай краіне дзейнічае прэзумпцыя згоды, і калі ты не хочаш аддаваць свае органы пасля смерці, можаш выказаць сваё жаданне пры жыцці, — кажа Ганна Клімовіч. — Жывёлы такой магчымасці пазбаўленыя. Дык чаму яны павінны служыць падаўжэнню жыцця чалавека? Вось у чым для мяне заключаецца галоўная этычная праблема. Я не разумею, чаму з-за таго, што я захварэла, павінна пацярпець нейкая жывая істота? У рэшце рэшт, усе мы смяротныя.


Фота University of Maryland School

Між іншым, Яўген Котаў падкінуў удзельнікам біяэтычнай дыскусіі дадатковую інфармацыю для асэнсавання: «Пры шэрагу сардэчных захворванняў пацыентам патрабуецца замена клапанаў сэрца. І ёсць такі від клапанаў, як біялагічныя пратэзы, якія робяцца са свіных клапанаў. Таксама можна прыгадаць трансплантацыю хворым на цукровы дыябет першага тыпу свіных клетак падстраўнікавай залозы, якія прадуцыруюць інсулін. Цікава, як вы ставіцеся да такой ксенатрансплантацыі?»

«А ці не замахваецца ксенатрансплантацыя на ідэнтычнасць асобы і ўспрыманне чалавекам уласнага цела? Гэта наогул нявывучаная тэма, немагчыма прадбачыць, што адчуе чалавек, якому будзе перасаджаны орган істоты іншага біялагічнага віду, — разважае Валерыя Сакольчык. — І ўвогуле, наколькі этычныя ў адносінах да пацыента такія навуковыя эксперыменты, калі прагназуемыя вынікі аперацыі існуюць толькі на паперы і невядома, наколькі можна прадоўжыць жыццё чалавека такім чынам?»

Тут можна згадаць і словы Дэвіда Бенета, якому сказалі, што не могуць даць яму чалавечае сэрца і прапанавалі выкарыстаць у якасці донарскага свіны орган. Той пажартаваў, запытаўшыся ва ўрача: «Доктар, скажыце, а я не буду рохкаць?»

### ПРЫНЦЫПЫ АДБОРУ

Трэба дадаць, што праз некалькі дзён пасля сенсацыйнага паведамлення пра трансплантацыю чалавеку сэрца свінні, грамадскасці сталі вядомыя некаторыя факты з мінулага Дэвіда Бенета, якія той, несумненна, не жадаў бы рабіць прадметам для абмеркавання. Высветлілася, што ўчарашні пацыент быў асуджаны ў 1988 годзе за сем нажавых раненняў, якія нанёс Эдварду Шумейкеру. Той быў паралізаваны і наступныя 19 гадоў правеў у інваліднай калясцы. У 2005 годзе ў яго здарыўся інсульт і праз два гады мужчына памёр, не дажыўшы да 41 года. Затое ў Бенета, які выйшаў з турмы, жыццё наладзілася, а сёння ён увогуле стаў медыйнай «зоркай». **У сувязі з гэтым сям'я Эдварда Шумейкера задалася пытаннем, чаму шанц на новае сэрца атрымаў менавіта гэты чалавек?** З улікам праблемы дэфіцыту донарскіх органаў не ўсе пагаджаюцца з тым, што асуджаным за гвалтоўныя злачынствы забяспечваецца працэдура выратавання жыцця, у якой маюць вострую патрэбу людзі без крымінальнага мінулага. Але большасць урачоў такую пазіцыю не падзяляе, таму што ключавы прынцып у медыцыне — лячыць усіх, хто хворы, незалежна ад таго, хто яны.

— Я ўпэўненая, што калі чалавек ужо быў пакараны за свой учынак, ярлык злачынцы не можа суправаджаць яго ўсё жыццё, — падкрэслівае **кандыдат юрыдычных навук Алена БАСАЛАЙ**. — І нават калі ён яшчэ адбывае пакаранне за здзейсненае злачынства, то таксама мае права на атрыманне медыцынскай дапамогі. Адмова ў аказанні медыцынскіх паслуг не можа быць складнікам пакарання.

У медыцынскім цэнтры Універсітэта Мерыленда адмовіліся паведаміць, ці ведалі яны аб крымінальным мінулым Бенета. У пісьмовай заяве афіцыйныя асобы запэўнілі, што шпіталь аказвае «жыццявыратавальную дапамогу кожнаму пацыенту, які ўваходзіць у іх дзверы, зыходзячы з іх медыцынскіх патрэб, а не іх паходжання або жыццёвых абставін». «Гэты пацыент звярнуўся да нас у крайняй патрэбе, — дадалі афіцыйныя асобы, — і рашэнне аб яго праве на трансплантацыю было прынята выключна на падставе медыцынскіх звестак».

— У кожным цэнтры трансплантaлогіі дзейнічаюць лакальныя біяэтычныя камітэты. Прынцыпы адбору рэцыпіентаў, якія могуць атрымаць донарскі орган, улічваюць многія параметры, а не толькі антрапаметрычныя даныя і імуналагічныя крытэрыі, — падкрэслівае Яўген Котаў. — Усе лісты чакання пастаянна ўдасканальваюцца, і з пункту погляду біяэтыкі ў тым ліку. Прынцып адбору спрабуюць зрабіць максімальна эфектыўным і справядлівым. Што датычыцца містара Бенета, то не сумняваюся, што ён быў цалкам праінфармаваны пра ўсе магчымыя рызыкі, таму што раней такія аперацыі ў свеце не рабіліся. Ці думаў Дэвід Бенет, што прынясе карысць чалавецтву, пагадзіўшыся на гэту найскладанейшую аперацыю, мы не ведаем. Мяркую, што ён дакладна разумеў, што калі не возьме гэту выратавальную саломінку, то больш шанцаў у яго не будзе.

— Мы ўсе разважаем тэарэтычна, з улікам нашага цяперашняга статусу, — дадала Алена Басалай, — а вось калі б аналагічная праблема са здароўем датычылася нас ці нашых блізкіх, то, напэўна, на ксенатрансплантацыю мы паглядзелі б зусім з іншага пункту гледжання...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
10 ЛЮТАГА 2022 г.
ЧАЦВЕР
№ 3 (15926)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Вікторыя ВАРАБ'ЁВА:

# «Нам зноў удалося прывезці карону ў Беларусь»



**На XXX Міжнародным конкурсе прыгажосці і таленту «Каралева студэнцтва Саюзнай дзяржавы», які прайшоў у студзені ў Стаўрапалі, перамагла беларуска. Яе імя цяпер на слыху ў многіх. Яна — дзяўчына творчая. І акрамя таго, што вучыцца ў Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце, яшчэ займаецца танцамі, наведвае народны ансамбль «Віцябчанка» і выкладае ўменне падаць сябе ў «Студэнцкім доме моды». Мы вырашылі распытаць Вікторыю пра закулiссе конкурсу, цану выбару і ўменне не губляць «балансу» па жыцці.**

***— Віка, віншую вас з перамогай. Раскажыце, што дае вам і да чаго абавязвае тытул «Каралева студэнцтва Саюзнай дзяржавы»?***

— Мае абавязкі пакуль што яшчэ канкрэтна не акрэсліліся. Але я лічу, што атрымаць такое званне — пачэсна і для мяне, і для краіны. Нам зноў за апошнія пяць гадоў удалося прывезці карону ў Беларусь. Я асабіста даўно марыла аб такой перамозе, таму магу сказаць, што здзейснілася мая маленькая запаветная мара.

***— І якія ўражанні пакінуў конкурс?***

— У мяне засталіся толькі самыя прыемныя. Я думала, што ў працэсе конкурсу і непасрэдна ў дзень фіналу будзе падтрымка расіянамі сваіх прадстаўнікоў. Гэта звычайная гісторыя на такіх спаборніцтвах, аднак кожная з нас адчувала каласальную падтрымку і за кулісамі, і падчас кожнага выхаду на сцэну. На конкурсе мы паспелі за кароткі час добра пасябраваць з іншымі канкурсанткамі, і таму кожная з нас хварэла за астатніх, нібыта за сябе. Зусім не адчувалася атмасферы барацьбы, саперніцтва, з якімі часта асацыіруюцца такія мерапрыемствы. Асобна хочацца падзякаваць людзям са Стаўрапаля за цёплы і гасцінны прыём.

***— Сам горад удалося паглядзець?***

— Бачылі, але мала. Пабывалі ў музеі, у цэнтры горада і крыху вывучылі раён, дзе знаходзіўся наш інтэрнат. А ўвесь астатні час мы знаходзіліся на рэпетыцыях. Калі рабіць высновы з таго, што ўсё ж змагла ўбачыць, то, думаю, з задавальненнем вярнулася б туды зноў для больш дэталёвага знаёмства. Атмасфера вельмі гэтаму спрыяе.

***— У праграме фіналу праходзілі розныя конкурсы. Якімі былі вашы адчуванні, у прыватнасці, калі прымяралі вясельныя сукенкі і нацыянальныя вобразы?***

— Вясельную сукенку прымярала ўжо не першы раз. У нас і на абласным туры быў выхад у такіх строях. Таму, акрамя таго, што гэта неверагодна прыгожа (а я не з тых дзяўчат, хто марыць хутчэй прымераць гэтую сукенку ў жыцці), мне спадабалася, як выглядаю ў нязвыклым для сябе вобразе. А вось калі апранала нацыянальны строй, то адчувала гонар ад таго, што прадстаўляю сваю краіну, а не проста саму сябе, як бывае на многіх падобных конкурсах.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

Майстар-клас

# ЗАМЕСТ КАНЬКОЎ — РОЛІКІ

## Насамрэч гэта не дзіцячая забава, а алімпійскі від спорту

**Адной з самых папулярных актыўнасцяў зімой з'яўляецца катанне на каньках. Але што рабіць аматарам гэтага спорту з надыходам цяплыні? Адказ на пытанне дакладна ведае заснавальнік мінскай ролер-школы, майстар спорту, шматразовы чэмпіён Беларусі ў спідскейтынгу, пераможца чэмпіянатаў Расіі і Украіны, удзельнік кубкаў свету Сяргей МІНІН.**



— Любоў да ролікаў з'явілася ў мяне яшчэ ў самым дзяцінстве, але знаёмства з гэтым відам спорту пачалося менавіта з канькоў. Калі быў зусім малы, мяне прывялі на заняткі ў дзіцячую юнацкую канькабежную школу. І літаральна з першых заняткаў галоўнай мэтай і марай было стаць класным прафесійным хакеістам. Але ўсё змянілася з надыходам цёплага надвор'я. Тады яшчэ не было крытых катко ў, і, каб не спыняць трэніроўкі, выкладчык прынёс ролікі, і мы пачалі вучыцца тэхніцы катання і трукам.

Наш герой прызнаецца, што і сам не заўважыў, як ролер-спорт перайшоў са звычайнага дзіцячага захаплення ў прафесію. Усведамленне гэтага прыйшло, калі ён скончыў універсітэт фізічнай культуры і заключыў першыя спартыўныя кантракты.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

Віртуальны свет

# НЕ ПРАГУЛЯЦЬ СВАЁ ЖЫЦЦЁ

## Што стаіць за кіберзалежнасцю?

**Ці чулі вы навіну? Геймер з Германіі зламаў шыю, выкарыстоўваючы VR-шлем. Прычынай траўмы стала не падзенне. 31-гадовы мужчына распавёў, што да чатырох гадзін у дзень гуляў у VR, часта паўтараў адны і тыя ж рухі рукамі, плячыма і галавой «у адпаведнасці з рытмічнымі візуальнымі і музычнымі ўказаннямі». З-за гэтага адзін з пазванкоў шыі моцна сцёрся і... трэснуў, не вытрымаўшы нагрузкі. Урачы з бальніцы Лейпцыгскага ўніверсітэта, якія аказвалі гаротніку дапамогу, упэўнены: гэта першы ў свеце задакументаваны пералом, звязаны з віртуальнай рэальнасцю. Звычайна ад такіх траўмаў пакутуюць спартсмены, вайскоўцы і шахцёры. Вось такое нечаканае наступства ад захаплення гульнямі...**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*



ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
10 02 2022 г.

# НЕ ПРАГУЛЯЦЬ СВАЁ ЖЫЦЦЁ



## Магутная індустрыя

Увогуле, павышаная цікавасць да відэагульняў, абумоўленая самаізаляцыяй, а таксама запуск кансоляў новага пакалення прывялі да таго, што 2020 і 2021 гады, нягледзячы на крызіс, аказаліся для гульнявой індустрыі вельмі прадукцыйнымі. Да пандэміі ў свеце ўжо было 2,5 мільярда гульцоў. З-за каранцінных абмежаванняў большую частку вольнага часу людзі праводзілі дома, што прывяло да выбуховага росту попыту на тавары для забаў. Анлайн-гульні дапамагалі ім справіцца з няўпэўненасцю, разнастаіць руціну, кантактаваць без рызыкі для здароўя падчас пандэміі. Не ўсе гулялі раней, для многіх гэта быў першы іх вопыт... Эксперты Newzoo палічылі, што ў 2020 годзе гульняманы па ўсім свеце, якія іграюць на ПК, кансолях і мабільных прыладах, выдаткавалі на сваё захапленне 159,3 мільярда долараў.

Між іншым, залежнасць ад відэагульняў увайшла ў апошнюю рэдакцыю Міжнароднай класіфікацыі хвароб. Дакумент аб прызнанні залежнасці ад відэагульняў хваробай быў складзены Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя летам 2018 года, а з 1 студзеня бягучага года набыў моц. Афіцыйна захворванне называецца «гульнявым расстройствам». Яно характарызуецца пастаянным або перыядычным парушэннем здольнасці кантраляваць частату або колькасць часу, які праводзіцца за відэагульнямі ў інтэрнэце і афлайн.

Сёння распрацавана мноства разнастайных камп'ютарных гульняў, але іх стваральнікі выпускаюць у свет усё новыя. Гэта магутная індустрыя, якая кіруецца сваімі законамі. Часта вытворца адназначна не можа пазначыць жанр новай гульні, бо мае намер прадаць свой праграмны прадукт найбольшай колькасці карыстальнікаў і не хоча звужаць тэматыкай кола патэнцыйных пакупнікоў. Ад распрацоўшчыкаў гульняў можна пачуць рэкламныя слоганы накшталт «А ці ведалі вы, што камп'ютарныя гульні злучаюць сэрцы? А пра тое, што прыхільнікі кіберспорту — самыя надзейныя і адказныя спадарожнікі ў жыцці?»

Колькасць дзяцей і падлеткаў з залежнасцю ад інтэрнэту і камп'ютарных гульняў год ад году павялічваецца.

— У Беларусі агульнанацыянальных буйнамаштабных даследаванняў па вывучэнні гульнявой і інтэрнэт-залежнасці не праводзілася, — канстатуе **доктар медыцынскіх навук, прафесар, урач-псіхіятр, псіхатэрапеўт Адзінага рэестра прафесійных псіхатэрапеўтаў Еўропы Сяргей ІГУМНАЎ.** — Але назіраецца лавінападобны рост праблем, звязаных з агрэсіяй, якую фарміруе ў тым ліку і віртуальная прастора. З ранніх гадоў дзеці становяцца выпадковымі сведкамі гвалту ў кіно і інтэрнэце. У наш час нават першакласнікі гуляюць у «стралялкі», сутнасць якіх — у знішчэнні іншых персанажаў.

## Кіраваць героем

Віртуальны свет гульняў часта вельмі жорсткі і бязлітасны. Калі геймер працягły час знаходзіцца ў такім асяроддзі, ён пераносіць яго прынцыпы на рэчаіснасць і адчувае сябе максімальна неабароненым: у рэальным жыцці ўсе глядзяць на яго коса, а ўсё, што акружае, уяўляе для яго вялікую пагрозу. Такое стаўленне да свету называецца высокім узроўнем трывожнасці асобы.

**Адна з самых небяспечных разнавіднасцяў — role playing game (RPG), ролевая гульня, у якой геймер самастойна выбірае персанаж з прапанаванай галерэі вобразаў, апранае яго, надзяляе рысамі характару і здольнасцямі.** У гульні прадугледжана свабода дзеянняў, якая ўплывае на працэс і канчатковы вынік. Дадзеныя тыпу гульні выклікае ўстойлівае прывыканне, гулец атаясамлівае сябе з персанажам, развівае яго па сваім вобразе і падабенстве. Самым прыцягальным для геймераў у RPG з'яўляецца магчымасць кіраваць героем, геймплэй — гульнявая дынаміка, якая выяўляецца ў разнастайнасці перамяшчэнняў, дзеянняў і ўзаемадзеянні з іншымі персанажамі.

Асноўнае прызначэнне героя ў такіх гульнях — пастаянная барацьба з кім-небудзь або за што-небудзь. Як і ў жыцці, у віртуальным свеце ідзе супрацьстаянне дабра і зла, светлых і цёмных сіл, калі прайграюцца падзеі на фантастычныя ці міфалагічныя сюжэты. Некаторыя ролевыя гульні даюць геймеру магчымасць гуляць за злосны персанаж у вобразе монстра або ведзьмака, пярэваратня ці вампіра. І хоць усе падобныя істоты, па сутнасці, ворагі людзей, яны маюць сваіх аматараў, прыхільнікаў і паслядоўнікаў (дастаткова паглядзець на аб'ёмы продажаў дыскаў). Агрэсіўныя імпульсы назапашваюцца ў чалавеку па жыцці, а месцам выхаду гэтай агрэсіі становяцца камп'ютарныя гульні.

У 2021 годзе на экраны выйшаў амерыканскі навукова-фантастычны блокбастар «Галоўны герой», у цэнтры якога аказваецца масавая ролевая анлайн-гульня, дзе кожны можа выбраць для сябе найбольш блізкага персанажа. Ці варта казаць, якіх персанажаў выбіраюць гульняманы? У віртуальным горадзе пастаянна адбываюцца крадзяжы, напады на банкі, перастрэлкі, пагоні, «забойствы» іншых персанажаў. І раптам з'яўляецца «хлопец у блакітнай кашулі», які набірае ачкі ў гульні выключна за кошт добрых спраў, таму і становіцца сусветнай сенсацыяй. Фільм вельмі красамоўна перадае метамарфозы, якія адбываюцца з людзьмі ў віртуальным і рэальным свеце.

**Ёсць гульні, жанр якіх дазваляе геймерам кіраваць дзяржавай, планетай і Сусветам.** Аднак іх роля заключаецца не толькі ў памнажэнні багацця і дабрабыту ўласнага народа, але таксама ў пакаранні і памілаванні падначаленых і рабоў, такім чынам, у гульцоў развіваецца манія велічы.

Звяртаюць спецыялісты ўвагу і на эфект прысутнасці, які дае камп'ютарная гульня: чалавек можа адчуць сябе часткай віртуальнага свету. У выніку ён пазбаўляецца ад грузу звыклых перажыванняў, адчувае лёгкасць і, забываючы пра тое, што ёсць у яго сапраўдным жыцці, стварае сабе новую біяграфію, цалкам уваходзячы ў створаны вобраз...

## У палоне «сетак»

Нядаўна ў Доме прэсы ўвазе грамадскасці была прадстаўлена кніга «Псіхалогія дэвіянтных паводзін». Яе аўтары — **Сяргей Ігумнаў і Аляксей Ягораў, доктар медыцынскіх навук, прафесар, урач-псіхіятр, загадчык лабараторыі нейрафізіялогіі і паталогіі паводзін Інстытута эвалюцыйнай фізіялогіі і біяхіміі Расійскай акадэміі навук.**

На прэзентацыі выдання Аляксей Ягораў падкрэсліў, што сёння ў падлеткаў з'явіліся новыя формы гульняманіі і наркатычнай залежнасці. Адпаведна, змяніліся і формы дэвіянтных паводзін. Асобная ўвага надаецца ў кнізе тэме «Віртуальнае асяроддзе і сацыяльныя сеткі як фактар уплыву на самаразбуральныя паводзіны». Дадзеная праблематыка не дае спецыялістам «сумаваць». Як заўважае спецыяліст, **для хлопчыкаў прадметам залежнасці звычайна становяцца камп'ютарныя гульні, а для дзяўчынак — сацыяльныя сеткі.**

Усе хочуць быць прызнанымі, атрымліваць увагу, быць паспяховымі, пры гэтым траціць на гэта як мага менш асабістых рэсурсаў. А сацыяльныя сеткі для гэтага прыдатныя найлепш, бо ўсяго трэба толькі загрузіць асабістае фота, дадаць да яго тэкставую інфармацыю (часцей за ўсё выдуманую) або зрабіць рэпост якога-небудзь тэксту з суполкі, і ты атрымліваеш вялікую колькасць «лайкаў». Даволі проста выдаліць непажаданы каментарый або адаслаць у чорны спіс няўручнага сябра. Між іншым, спецыялісты папярэджваюць, што самыя галоўныя веды пра навакольны свет можна атрымаць толькі ва ўзаемадзеянні і стасунках з рэальнымі людзьмі.

У верасні мінулага года Цэнтр сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДЭУ па заказе Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў вывучаў устаноўкі і каштоўнасці сучаснай беларускай моладзі. Даследаванне паказала, што пераважная большасць рэспандэнтаў ва ўзросце ад 14 да 17 гадоў (85,2 %) часцей за ўсё заходзіць у інтэрнэце менавіта ў сацыяльныя сеткі. Прыкметна менш запатрабаваны ў маладых беларусаў сайты з інфармацыйяй даведачнага характару, блогі і паштовыя серверы. Найбольш папулярныя сацыяльныя медыя, якія выкарыстоўваюцца беларускай моладдзю некалькі разоў на дзень, — TikTok (63,5 %), Instagram (63,4 %), «УКантакце» (60,1 %) і YouTube (58,7 %).

## Трывожныя сімптомы

У кіберзалежнасці ёсць шмат прыкмет. Гэта страта кантролю за часам знаходжання за камп'ютарам. Ігнараванне сваіх абавязкаў. Усе думкі сканцэнтраваны толькі на сюжэце гульні. Прысутнічае неадчэпнае жаданне вярнуцца ў віртуальны свет. Калі кіберзалежнага чалавека пазбаўляюць магчымасці сядзець за камп'ютарам, у яго ўзнікаюць парушэнні ў мозгу, якія знікаюць адразу, як толькі яму вяртаюць камп'ютар.

Бяссонніца таксама можа сведчыць пра залежнасць. Уся справа ў тым, што гульні стымулююць працэсы ўзрушанасці ў цэнтральнай нервовай сістэме. Таму геймеру так цяжка адарвацца ад гульні, і ў выніку яна можа зацягнуцца нашмат даўжэй, чым ён планаваў. Але і пасля заканчэння гульні чалавек не можа адразу супакоіцца. Пасля гэтага ён, пераўзбуджаны, яшчэ нейкі час ляжыць у ложку, а перад яго вачыма мільгаюць вобразы з манітора ці смартфона. Чыста псіхалагічна ад гульні адарваца складана. Геймер спачатку проста не высыпаецца, а потым рэгулярны недахоп сну адбіваецца ўжо на яго паводзінах. Хранічны недасып пераўтварае чалавека ў неўротыка.

Як і любую хваробу, кіберзалежнасць лягчэй папярэдзіць, чым лячыць.

— Найлепшая прафілактыка — разнастайнае жыццё. Падлетак павінен разумець, што простыя афлайн-радасці дастаўляюць задавальненне не меншае, чым знаходжанне ў сеціве, — кажа Аляксей Ягораў. — А яшчэ, як бы банальна гэта ні гучала, бацькі павінны любіць сваіх дзяцей, займацца іх выхаваннем і правільна структураваць іх час. Падлетку неабходна дакладна ўяўляць, што яму можна, а што нельга, адчуваць падтрымку блізкіх. Дзіцяці важна адчуваць клопат і атрымліваць станоўчыя эмоцыі ў сям'і, інакш ён пачне шукаць іх у іншым месцы...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

*Лакацыі актыўнасці*

# ЧАТ-БОТ ДЛЯ БУДУЧЫХ БАЙЦОЎ СТУДАТРАДАЎ

**Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў БРСМ плануе да запуску ў месенджары Telegram чат-бот «У студатрадзе.by» ў дапамогу маладым людзям, якія жадаюць правесці працоўнае лета ў складзе студэнцкіх атрадаў, паведамілі ў Цэнтральным камітэце Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі.**

Традыцыйна ў сакавіку стартуе промапраект Рэспубліканскага штаба студэнцкіх атрадаў «Выбіраем студатрад». Сёлета запісацца ў іх стане яшчэ прасцей. Гэта можна будзе зрабіць праз чат-бот «У студатрадзе.by», які плануецца запусціць у першы веснавы месяц у месенджары Telegram. Ім можна скарыстацца ў любым кутку краіны, нават самым аддаленым. Студэнты і навучэнцы змогуць пазначыць праз «У студатрадзе.by» сваё жаданне папрацаваць у студэнцкім атрадзе, адзначыць перыяд, калі яны хочуць гэта зрабіць, профіль атрада, жаданую заработную плату. Такі зручны і просты дадатковы канал камунікацыі з моладдзю дазволіць у цэлым павялічыць колькасць працаўладкаваных у летні перыяд.




Беларускія студэнцкія атрады сталі брэндам не толькі БРСМ, дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, але і ў цэлым Беларусі. БРСМ ставіць перад сабой задачу зрабіць Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў маладзёжным цэнтрам занятасці, каб любы малады чалавек, які жадае папрацаваць, у тым ліку і летам, ведаў, куды можна звярнуцца напрамую і атрымаць дапамогу ў працаўладкаванні. «Маладыя людзі павінны разумець: каб мець грошы, іх трэба зарабляць. Адказ на пытанне, як гэта зрабіць, якраз і даюць студатрады, таму што яны — гэта канкрэтныя справы і рэальныя вынікі», — рэзюмавалі ў ЦК БРСМ.

Любы малады чалавек пачынаючы з 14 гадоў можа працаваць у складзе студэнцкага атрада, у тым ліку круглы год, існуе льготнае падаткаабкладанне для наймальнікаў, зніжана стаўка падаходнага падатку для ўдзельнікаў руху. Вядома ж, размова ідзе і аб атрыманні новых ведаў, навыкаў у асваенні новых прафесій, магчымасці дакрануцца да будаўніцтва сваёй краіны. Не так даўно былі падведзены вынікі 2021 года. Ён стаў для Саюза моладзі дастаткова паспяховым, таму што атрымалася працаўладкаваць у складзе студэнцкіх атрадаў больш за 34 тысячы маладых людзей.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота з сайта БРСМ.**

# ЗАМЕСТ КАНЬКОЎ — РОЛІКІ

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Наш герой прыгадвае, што адной з самых складаных частак рэалізацыі задумы стала прыцягненне наведвальнікаў. Справа ў тым, што ў большасці краін СНД яшчэ існуе стэрэатып, быццам ролікавае катанне — гэта забава для дзяцей і падлеткаў. Таму Сяргею прыйшлося тлумачыць аўдыторыі, што ролікі — гэта не цацка або забава, у першую чаргу, спорт і здароўе. Гэтак жа, як бег або футбол, толькі менш распаўсюджаны ў нас, але такі ж карысны, а часам нават і больш экстрэмальны.

— Адкрыўшы сваю школу, я адразу зрабіў разнапланавыя гурткі не толькі па ўзроўні падрыхтоўкі, але і па ўзросце. Дарэчы, самыя першыя групы былі не дзіцячыя, а дарослыя. Працэнтаў восемдзесят складалі дзяўчаты і жанчыны і ўсяго дваццаць — хлопцы. Пазней зрабілі і дзіцячы набор. Бацькі часта задаюць пытанне, з якога ўзросту можна прыводзіць да нас сваіх сыноў і дачок, на што мы адказваем: у тры з паловай года. Гэта мінімальны парог для навучання ролікаваму спорту. Вядома, адна з галоўных умоў для

**Наш герой прызнаецца, што і сам не заўважыў, як ролер-спорт перайшоў са звычайнага дзіцячага захаплення ў прафесію.**

зусім маленькіх дзяцей — каб яны ўжо ўпэўнена хадзілі. Што датычыцца дарослых, то канкрэтных узроставых крытэрыяў няма. Галоўнае — жаданне, а ўсяму астатняму мы навучым. Адзіны крытэрый — трэба абавязкова прынесці даведку аб стане здароўя, бо ёсць пэўныя захворванні, якія нельга сумяшчаць з экстрэмальнымі і цяжкімі фізічнымі нагрузкамі. Наогул, матывам для прыходу на занятку служаць зусім розныя прычыны. Хтосьці проста хоча ўсебакова развіць сябе ці сваё дзіця, пахудзець... Але ёсць і тыя, хто прыходзіць з выразным жаданнем займацца гэтым прафесійна. У такім выпадку нашы выкладчыкі падрыхтоўваюць іх да розных марафонаў, а самых лепшых — да алімпійскіх спаборніцтваў.

Галоўнай складанасцю для людзей, якія хочуць пачаць развівацца ў гэтым кірунку, становіцца правільны выбар ролікаў. Наш герой раіць усім пачаткоўцам пачынаць навучанне з самых звычайных. Часцей за ўсё выбіраюць рассоўныя мадэлі, якіх хапае як правіла на чатыры-пяць гадоў. Аднак асабліва важная якасць інвентара, бо калі сэканоміць, то потым ідуць вялікія сумы на лячэнне ніжніх канечнасцяў. Могуць узнікнуць праблемы з суставамі, будзе парушацца хада і многае іншае.



— Разумеючы ўсю важнасць нашай справы, да падбору трэнерскага складу ў школе ставяцца з асаблівай увагай, — падкрэслівае Сяргей Мінін. — Усе з работнікаў альбо ўжо маюць вышэйшую адукацыю, альбо заканчваюць навучанне ў ВНУ. Пры вызначэнні чалавека на ролю выкладчыка ў якім-небудзь кірунку заняткаў улічваюцца яго рысы характару, досвед, узнагароды і, вядома ж, навык аказання першай медыцынскай дапамогі, бо ад падзенняў не застрахаваны нават самы дасведчаны ролер, не кажучы ўжо пра пачаткоўцаў.

Сяргей акцэнтуе: для таго, каб займацца гэтым відам спорту, не трэба нечага звышнатуральнага ў плане інфраструктуры.

— На мой погляд, у ролерспорце наша краіна дастаткова развітая ў плане падрыхтоўкі спартсменаў. У Мінску ёсць ролер-трасы, але што лепей за ўсё, дык гэта наяўнасць праферыраванага трэка ў Салігорску. Гэта вельмі вялікі поспех і рух да сусветнага ўзроўню, бо такіх месцаў, якія пабудаваны па найбольш сучаснай тэхналогіі і парабалічнымі контрухіламі, у свеце ўсяго тры. І я ўпэўнены, што хутка туды будуць прыязджаць спартсмены з усіх краін і праводзіць разнастайныя турніры і спаборніцтвы. А пакуль вы можаце развіваць свае навыкі самастойна ў парках ці ў нашай ролер-школе, дзе вам заўжды будуць рады.

**Ангеліна НОВІКАВА.**
**Фота дадзена героем.**

*Знайсці сябе*

# СІЛА Ў РУКАХ — АД СІЛЫ ДУХУ,

## або Як ногі да армрэстлінгу давялі

**У 1990-х гадах распаўсюджванне атрымаў новы від барацьбы на руках — армрэстлінг. Хоць ён і да гэтага часу на слыху, але мала хто дабіваецца прафесійных поспехаў у дадзеным відзе спорту. Іван ВЯРЭНІЧ, малады і амбіцыйны беларускі спартсмен, здолеў дасягнуць у ім вялікіх вынікаў.**



***— Чаму выбралі менавіта армрэстлінг?***

— Спортам я пачаў цікавіцца яшчэ ў дзяцінстве, у дзевяць гадоў. Што да армрэстлінгу, у яго прыйшоў зусім выпадкова, калі атрымаў траўму нагі. Тады вырашыў праверыць свае рукі і пачаў заўважаць вынікі. Пасля таго як на першых спаборніцтвах заняў прызавое найвышэйшае месца, прыйшло ўсведамленне, што армрэстлінг — гэта маё. На прафесійны ўзровень вырашыў выйсці яшчэ студэнтам. У свае дзевятнаццаць гадоў выканаў нарматыў кандыдата ў майстры спорту, у дваццаць адзін — майстра спорту Рэспублікі Беларусь і стаў найлепшым спартсменам у Беларусі сярод юніёраў, а праз год — сярод мужчын.

***— Якія яшчэ спартыўныя дасягненні?***

— На сёння я шматразовы чэмпіён Рэспублікі Беларусь па армрэстлінгу, уладальнік кубка Беларусі ў вагавай катэгорыі дзевяноста пяць кілаграмаў, абсалютны чэмпіён краіны па армрэстлінгу на левую руку, бронзавы прызёр чэмпіянату свету. Апошняе дасягненне на дадзены момант самае важнае. І, вядома ж, не збіраюся спыняцца на дасягнутым!

***— Як сям'я паставілася да новага занятку?***

— Заўсёды побач, падтрымлівае любы мой выбар і працавітасць. Лічу, што вельмі важна, калі ёсць падтрымка ад блізкіх. За гэта вельмі ўдзячны родным.

***— Як праходзяць вашыя трэніроўкі?***

— Па-рознаму, залежыць ад перыяду. У этапы спаборніцтваў у мяне па шэсць сілавых трэніровак у тыдзень і адна кардыя. Кожная доўжыцца ад трох да пяці гадзін. У дні, вольныя ад падрыхтоўкі да спаборніцтваў, трэніроўкі праходзяць у больш паслабленым рэжыме. Насамрэч спорт заўсёды са мной, без яго нікуды. Нават адпачынку аддаю перавагу актыўнаму, мяняю толькі сферы дзейнасці.

***— Як лічыце, якія патрэбны якасці, каб займацца армрэстлінгам?***

— На мой погляд, самая галоўная якасць не толькі для спартсмена, але і для любога, хто хоча дасягнуць вынікаў, — упартасць, мэтанакіраванасць і працавітасць. Без гэтага нікуды. Ну а прафесійныя навыкі прыходзяць падчас трэніровак.

***— Што самае складанае на шляху да спартыўнага поспеху?***

— У цяперашні час самым складаным для ўсіх спартсменаў з'яўляецца матывацыя. Калі загарэўся сваёй мэтай, дык павінен працаваць і выкладвацца на ўсе сто працэнтаў. Мая галоўная мэта і матывацыя на дадзены момант — выйграць Кубак свету па армрэстлінгу. Гэта самыя прэстыжныя спаборніцтвы ў свеце — там збіраюцца наймацнейшыя спартсмены планеты. А ў далёкай будучыні планую заняцца трэнерствам, мне гэта вельмі падабаецца. Акрамя спартыўных мэт, для мяне асноўная задача — стварэнне сям'і, падтрыманне душэўнага спакою і забеспячэнне ўсім неабходным для жыцця.

***— Ці бываюць у вас паражэнні?***

— Яны здараюцца ва ўсіх. Шчыра кажучы, вельмі цяжка іх пераношу. Не люблю прайграваць. Лічу, што калі стаў другім, дык ужо прайграў. Пасля паражэння імкнуся «адцягнуцца», змяніць абстаноўку. Але, нягледзячы на такія сітуацыі, заўсёды разумею, што трэба ісці наперад і дасягаць мэты.

***— А ці ёсць у вас кумір?***

— Захапляюся ўсімі спартсменамі, якія дасягнулі высокіх вынікаў. Яны падаюць прыклад для пераймання. Гледзячы на іх, з'яўляецца яшчэ адзін штуршок на шляху да мэты.

***— Чым захапляецеся акрамя спорту?***

— Я далёка не ўсе свае таленты яшчэ раскрыў. Шмат да чаго хочацца імкнуцца і над чым працаваць, таму не магу вылучыць нейкую адну сферу дзейнасці.

**Дзіяна ЛІСОЎСКАЯ,**
**вучаніца 8 класа СШ № 152 г. Мінска.**
**Фота дадзена героем.**

*Ход канём*

# Прыцягальная псіхалогія шахмат

**У сучасным свеце большасць людзей спорт асацыіруе найперш з вялікай фізічнай нагрузкай. Але ж існуюць і інтэлектуальныя віды. Адным з такіх з'яўляюцца шахматы. Сёння яны ўключаны ў рэестры відаў спорту ў ста дзяржавах свету. Мы пагаварылі з трэнерам аднаго са сталічных шахматных дамоў Міхаілам ЖЫКІНЫМ і высветлілі ўсе тонкасці гэтай гульні.**



— Я пазнаёміўся з шахматамі ў сем гадоў, але сур'ёзна вывучаць і гуляць пачаў значна пазней. У шахматы як спорт прыйшоў досыць позна, у пятнаццаць гадоў. У дзяцінстве быў ціхім і нетаварыскім, мне больш падабалася думаць і назіраць, чым гаварыць і займацца рухомымі гульнямі з аднагодкамі. Па гэтай прычыне шахматы падышлі ідэальна. Мяне прыцягвала іх велічная таямнічасць, хацелася даведацца больш, знайсці саму сутнасць гульні. Варта мне было даведацца пра шахматы бліжэй, як я літаральна закахаўся ў іх. Зараз з настальгіяй прыгадваю, як пачынаў спасцігаць асновы гэтай гульні, седзячы за сталом у шахматным клубе і ўважліва слухаючы трэнера.

Падчас вучобы ў ВНУ наш суразмоўнік хутка раскрыў здольнасці ва ўніверсітэцкай зборнай камандзе па шахматах, дзе працягнуў развіваць свой талент. У той жа час ён уладкаваўся на работу трэнерам у адзін са сталічных цэнтраў дадатковай адукацыі. І атрымаў там свой першы выкладчыцкі вопыт і вырашыў далей развівацца ў гэтым кірунку.

— Я такі чалавек, які ў прынцыпе не можа доўга займацца тым, што не падабаецца. Роберт Джэймс Фішэр, адзінаццаты чэмпіён свету, аднойчы сказаў: «Шахматы — маё жыццё». Гэта ж у поўнай меры магу сказаць і пра сябе. Зразумела, хацелася б дамагчыся больш спартыўных вышынь. На дадзены момант я маю першы спартыўны разрад, але не збіраюся на гэтым спыняцца.

Цяпер Міхаіл увесь свой час прысвячае трэнерскай дзейнасці і перадае веды іншым. І шчыра радуецца поспехам і дасягненням падапечных.

— Шахматы могуць асвойваць усе людзі незалежна ад узросту, полу і складу розуму. Усім будзе надзвычай карысна вывучэнне гэтай старажытнай гульні. Бо гісторыя шахмат налічвае каля паўтары тысячы гадоў, але толькі ў канцы XV стагоддзя яны атрымалі блізкі да сучаснага аблічча выгляд і скарылі тысячы сэрцаў. Немалаважную ролю адыгрываюць педагог і ўласнае жаданне. Калі з гэтымі двума складнікамі праблем няма, то ў вас усё атрымліваецца.

Па адукацыі наш суразмоўца не толькі педагог, але і псіхолаг. І шчыра прызнаецца, што калі б не шахматы, то працаваў бы ў гэтай сферы. А пакуль дадзеная навука з'яўляецца галоўным памочнікам у яго дзейнасці. Бо шахматы, хоць і здаюцца гульнёй простай, патрабуюць шмат намаганняў.

— Быць шахматыстам — вельмі цяжкая праца. Галоўная якасць тут — мэтанакіраванасць. Таксама трэба ўмець валодаць сабой, трымаць максімальную канцэнтрацыю ўвагі і прыняць паражэнні, бо гэта непазбежна нават для найлепшага гульца. Ну і, вядома ж, ніколі не здавацца.

**Ігнат СТАНКЕВІЧ,**
**вучань 9 класа Каладзішчанскай СШ № 2.**

SEX-БАЛЯСЫ

# Ну і ГАДжэТЫ!

**Пачну з фразы Веніяміна Карлавіча Рубілава ў выкананні колішняга квз-шніка, нашага земляка, Вадзіма Галыгіна: «К-а-л-і-і — т-а-д-ы-ы...» Ну як можна забыць? Тым больш рэмейк праз гады быў! Я да таго, як усё раней было зразумела — не тое, што цяпер, у час «тырнэтаў». («Гэта зараз перапіска нічога не значыць. Вось раней ты разумеў, што вельмі падабаешся бабе, якая піша, таму што кожнае СМС каштавала грошай».) Чулі нядаўнюю гісторыю (насамрэч іх безліч) пра тое, як барысаўчанін вёў перапіску на сайце знаёмстваў ад імя былой каханай?**

З заявай у міліцыю звярнулася 28-гадовая жыхарка Смалявіч. Дзяўчына расказала, што раней неаднаразова заходзіла з тэлефона маладога чалавека ў свой уліковы запіс. Пасля расстання мужчына вырашыў скарыстацца гэтым і нашкодзіць былой каханай. («Шкада, што нельга адправіць паведамленне з той жа інтанацыяй, з якой ты прагаварыў яго ў галаве».) Праваахоўнікі ўстанавілі, што 32-гадовы барысаўчанін, даведаўшыся, што тая зарэгістравана на сайце знаёмстваў, аўтарызаваўся ў яе профілі і вёў перапіску са старонкі, прапаноўваў паслугі інтымнага характару за грашовую ўзнагароду. Пры спробах заяўніцы выдаліць акаўнт падазраваны зноў яго аднаўляў і працягваў перапіску. («— Пачастуеце дзяўчыну келіхам чырвонага віна?» — «Не, у мяне ў кватэры не прыбрана». — «Пры чым тут гэта?» — «Тым больш, калі ні пры чым».)

А жыхар аўстралійскага горада Хобарт, штат Тасманія, некалькі месяцаў сачыў за аўтамабілем і тэлефонам былой дзяўчыны пры дапамозе спецыяльных дадаткаў. («Калі мая жонка нечакана падыходзіць да мяне, абдымае, цалуе і кажа: «Ведаеш, як я цябе люблю?», мне становіцца страшна. Машына? Здрада? Крэдыт? Цёшчу пажыць пазвала?») Мужчына дапамог ёй купіць машыну і такім чынам даведаўся ідэнтыфікацыйны нумар аўто. Пасля расстання ён выкарыстаў яго, каб атрымаць доступ да інфармацыі аб перасоўваннях дзяўчыны. («СМС ад добра выхаванага мужа: «Мацюкамі цябе прашу — ідзі дадому!»)



Праграма аўтаматычна перасылала даныя на яго электронны адрас і дазваляла дыстанцыйна ўключаць і выключаць пэўныя функцыі аўтамабіля. Акрамя таго, мужчына ўсталяваў на мабільны тэлефон сваёй ахвяры шпіёнскае праграмнае забеспячэнне, якое адсочвае яе месцазнаходжанне. Дзяўчына ў нейкі момант усё зразумела. («— Вой, Мойша, вы ўсе, мужчыны, аднолькавыя!» — «Розачка, вось калі б вы былі прыстойнай жанчынай, то не ведалі б за ўсіх мужчын!») Калі скарысталася ноўтбукам, замест яе акаўнта адкрылася электронная пошта мужчыны, які сачыў за ёй. Там дзяўчына ўбачыла паведамленні аб яе перамяшчэннях, карты месцаў работы і прыпаркавана аўтамабіля. («Хутка адзіным бяспечным носьбітам праўдзівай інфармацыі застанецца толькі плот».) Паліцэйскія абшукалі дом мужчыны і знайшлі ў яго запісной кніжцы даты заняткаў на курсах, якія планавала наведваць дзяўчына, спіс месцаў, дзе яна бывала, і іншую персанальную інфармацыю. У судзе падазраваны прызнаў віну. («Не ведаў, што знаходжуся ў адносінах, пакуль са мной іх не пачалі высвятляць».)

А ў Расіі некалькі гадоў таму разглядалі магчымасць увядзення крымінальнай адказнасці за прагляд тэлефона мужа і жонкі. («— Моня, вы жанаты?» — «Так... Але не вельмі!») Прапаноўвалася забараніць на заканадаўчым узроўні доступ сужэнцаў да гаджэтаў, у тым ліку і сотавых тэлефонаў адно аднаго, паколькі ў іх змяшчаецца канфідэнцыяльная асабістая і службовая інфармацыя. («Прыязджае мужык з тыднёвай камандзіроўкі, а ў яго сем штрафаў за курэнне на балконе...») Узлом смартфона адным з сужэнцаў, згодна з прапановай, павінен быў караццa па ўсёй строгасці расійскага Крымінальнага кодэкса як умяшанне ў прыватнае жыццё чалавека. («— Ты тэлефон Віктара ведаеш?» — «Не». — «Ну хоць бы прыблізна...»)

І што тут сказаць? Амерыканец, які рамантуе смартфоны, раскрыў жонцы кліента вочы на яго здрады. («— Ало, любімы, гэта ты?» — «Так, а хто гаворыць?») Мужчына аддаў майстру смартфон, усярэдзіне якога была цыдулка і купюра: «Калі ласка, скажыце маёй жонцы, што тэлефон не падлягае рамонту, яна жадае праверыць гісторыю званкоў. З мяне 100 долараў, дзякуй». Калі жонка прыйшла па тэлефон, майстар расказаў ёй усё. («Даслаў сваёй дзяўчыне на мабільнік паведамленне: «— Добрай ночы!» — «А чаму такім тонам?») Ён заявіў, што не адрамантаваў тэлефон і не хоча быць уцягнутым у сямейныя разборкі. Жанчына раззлавалася і сказала, што дасць яму 200 долараў, калі ён папрацюе смартфон. («Жонка — мужу: «— А ты любы, гляджу, прыбіральшчыкам падпрацоўваеш». — «З чаго ты ўзяла?» — «Цябе то з адной швабрай бачаць, то з другой...») Майстар пагадзіўся, у выніку да яго прыйшоў муж, накрычаў, пачаў граміць майстэрню і кідаць у яго розныя рэчы. Большасць каментатараў у сеціве пахвалілі рамонтніка за яго ўчынак, аднак некаторыя абвінавацілі ў парушэнні «кодэкса мужчынскага братэрства». («Вярнуўшыся дадому на гадзіну раней, я выявіў жудаснае: жонцы варыць боршч яшчэ гадзіну!»)

Эх... К-а-л-і-і — т-а-д-ы-ы... Насамрэч справа не ў сучасных тэхналогіях, а ў тым, хто і як іх выкарыстоўвае... («— Ало, хуткая?Ператэлефануйце мне, бо я з мабільніка званю!»)

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Нам зноў удалося прывезці карону ў Беларусь»




*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— На што рабілі акцэнт у апошнім вобразе?***

— Там усё базіравалася на легендзе прамоўніцкага конкурсу, якую трэба было распавесці. Мая гісторыя была пра русалку, і менавіта ад вобраза гэтай гераіні мы і адштурхоўваліся пры стварэнні нацыянальнага касцюма.

***— Акрамя прыгажосці, конкурс факусіраваўся на такіх паняццях, як сяброўства і лідарства... Што вы асабіста ўкладаеце ў іх?***

— Сяброўства для мяне заўсёды стаіць на першым месцы. І мне пашчасціла мець найлепшую сяброўку, чалавека, з якім побач адчуваеш падтрымку, разуменне і блізкасць. Таму ў ланцужку сяброўства — лідарства першае для мяне мае большую вагу. Дарэчы, лідарам я сябе таксама не лічу, бо заўсёды ёсць да чаго імкнуцца. І ніколі не трэба спыняцца на дасягнутым.

***— Але ж ці магчыма без лідарскіх задаткаў рэалізоўваць сябе настолькі living рознабакова, як гэта робіце вы?***

— З дзяцінства ў мяне прысутнічае імкненне заяўляць пра сябе, і таму па жыцці я выхоўваю ў сабе мэтанакіраванасць, якая і дапамагае рушыць наперад. Ведаеце, тыя ж конкурсы даюць стрыжань, не хочацца спыняцца. І такі настрой ужо застаецца з табой назаўсёды.

***— Скажыце, ці назіраеце, як змяняюцца людзі вакол па меры дасягнення пастаўленых мэт і заваёўвання новых перамог?***

— У мяне заўсёды было нешматлікае кола тых, з кім кантактую. Гісторыя пра дзесяць сяброўак — не пра мяне. Я імкнуся падтрымліваць сувязі толькі з самымі блізкімі. Вядома, часам здараецца і так, што з кімсьці вашы шляхі ў жыцці разыходзяцца. Але ў асноўным усе, хто быў побач са мной ад самага пачатку, застаюцца на маім баку па сёння. Мне, мабыць, пашчасціла.

***— Вашы творчыя задаткі з сям'і?***

— Так, бо мама з дзяцінства спявала і ўсюды выступала, але прафесійна звязала свой лёс з іншай сферай і стала тавараведам. Я, можна сказаць, у абодвух напрамках пайшла па яе слядах, і дагэтуль мне ўдаецца сумяшчаць гэтыя шляхі.

***— Зараз вы ўжо студэнтка чацвёртага курса. Чым прывабліве будучая прафесія таваразнаўцы?***

— Спачатку, калі я толькі паступіла на сваю спецыяльнасць, дапускала, што магу не звязаць жыццё з гэтым заняткам. З часам адкрыла для сябе, што мая прафесія вельмі рознабаковая і галоўнае — знайсці сваю нішу, дзе можна рэалізоўвацца і атрымліваць задавальненне. Пакуль мне ўсё падабаецца. Напрыклад, перад конкурсам здавала курсавую, у якой вывучала тэму экспертызы электранагравальных прыбораў, ацэнку якасці.

***— А як пакупнік заўсёды адстойваеце свае правы?***

— Так, не дарэмна ж вучуся ўжо чатыры гады! Калі бачу нейкія нюансы, якія ўказваюць на няякасны тавар, то іду і разбіраюся з праблемай. Я здольная адстаяць свой пункт гледжання.

***— Раскажыце пра «Студэнцкі дом моды» пры ўніверсітэце, дзе зараз з'яўляецеся кіраўніком...***

— У гэты калектыў я трапіла на першым курсе пасля свайго дэбютнага конкурсу прыгажосці. «Студэнцкі дом моды» з'яўляецца месцам, дзе любы ахвотны можа прайсці бясплатныя заняткі па дэфіле, расцяжцы, уменні трымацца на сцэне. Словам, спасцігнуць усё тое, што дазваляе лепш падаваць сябе. І я, як кіраўнік, на працягу года вучу гэтым сакрэтам іншых хлопцаў і дзяўчат. Бо тыя ж роўная спіна і прыгожая паходка ствараюць першае ўражанне пра нас, якое адыгрывае важную ролю.

***— А як лічыце, ці можа прыгажосць быць ключом да поспеху ў жыцці?***

— Усё залежыць ад таго, якую прыгажосць мы маем на ўвазе. Бывае, што знешне чалавек вельмі прывабны, але зусім неглыбокі. У маім разуменні прыгожымі нас робяць эмоцыі, уражанні і бляск у вачах.

***— Вы адзначылі ў адным інтэрв'ю, што галоўнымі складнікамі ўласнага поспеху лічыце пастаянную працу над сабой і ўпэўненасць у сабе ў любой сітуацыі. Як гэта ўдаецца?***

— Ад сваёй мамы я вучуся таму, каб быць цярплівай і ўседлівай. І часам, каб спасцігнуць нешта новае, здараюцца ў маім жыцці і бяссонныя ночы. Плаціць даводзіцца і тым, што менш часу, чым хацелася б, праводзіш дома з блізкімі людзьмі. І нейкія справы з прычыны загружанасці выпадаюць з ліку прыярытэтаў альбо адкладаюцца назаўсёды. Хацелася б, вядома, каб па-іншаму ўсё складвалася.

***— Якія заняткі даюць магчымасць адпачыць і перазагрузіцца сярод будняў?***

— З кожнай паездкі з задавальненнем вяртаюся ў свой родны Віцебск. І мне вельмі падабаецца прагульвацца па старым цэнтры горада, заходзіць ва Успенскі сабор. Для мяне там месца сілы, дзе я супакойваюся. Акрамя гэтага, падабаецца тэатр, але там выпадае бываць нячаста. А самае простае — гэта дома перад люстэркам патанцаваць ці зрабіць спартыўную трэніроўку. Тады атрымліваецца адключыць думкі і сканцэнтравацца на тым, што дае лёгкасць і бадзёрасць.

***— Што сёння ў 20 гадоў сказалі б сабе 30-гадовай?***

— Каб я заставалася такой жа маладой душою, а яшчэ пазітыўнай і жыццярадаснай. І няхай гэта не знікне ні з узростам, ні пад уплывам любых абставін.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота дадзены гераіняй.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
